ЯК І ДЗЕ ЗЛАВІЦЬ ЛЕТА?

10

ЧЫМ РАДАВАЎ «ЛІСТАПАД»

13

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

12 ЛІСТАПАДА 2022 г. СУБОТА № 223 (29845)

ЛІЧБА ДНЯ

Больш за 16 млрд рублёў

складуць расходы на выплату пенсій у 2022 годзе, паведаміла Міністэрства працы і сацыяльнай абароны. У снежні на выплату пенсій будзе затрачана Br1,5 млрд, з іх Br68 млн — на іх павышэнне згодна з Указам № 397 ад 10 лістапада 2022 года «Аб павышэнні пенсій». З 1 снежня гэтага года ў адпаведнасці з гэтым указам павышаюцца ўсе віды працоўных пенсій (па ўзросце, за выслугу гадоў, па інваліднасці, з прычыны страты карміцеля). У выніку пераразліку памер працоўнай пенсіі будзе павышаны на 5 працэнтаў. У Мінпрацы падкрэслілі, што сёлета гэта трэцяе павышэнне працоўных пенсій. Раней яны павышаліся ў сакавіку на 7 % і ў жніўні на 10 %. Сярэдні памер пенсіі па ўзросце непрацоўнага пенсіянера ў снежні 2022 года складзе 670 рублёў. Такім чынам, у параўнанні са снежнем 2021 года пенсія павялічыцца на 23 працэнты.

КАРОТКА

- Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава сустрэлася з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом ААЭ ў Рэспубліцы Беларусь Ібрагімам Салімам Махамедам Аль-Мушарахам.
- **У Беларусі можа з'явіцца новая сацыяльная паслуга персанальнага асістэнта.**
- На сайце ЕЭК з'явіўся калькулятар штрафаў за парушэнні правілаў канкурэнцыі.
- **Мінпрыроды і НАН заявілі, што рысь немэтагодна выключаць з Чырвонай кнігі.**

ISSN 1990 — 763X

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«КОЖНЫ КАВАЛАК ТАКОЙ ЗЯМЛІ ПАВІНЕН БЫЦЬ ВЫКАРЫСТАНЫ НА КАРЫСЦЬ КРАІНЫ»

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка расставіў канкрэтныя, нават жорсткія акцэнты па тэме меліярацыі

У Талачынскім раёне кіраўнік дзяржавы пабываў на ААТ «Амкадор-КЭЗ», дзе азнаёміўся з вытворчасцю тэхнікі для патрэб меліярацыі. Тэму меліярацыі беларускі лідар неаднойчы закранаў падчас летніх рабочых паездак па краіне. Падчас семінара-нарады па пытаннях аднаўлення і выкарыстання меліяраваных земляў у краіне, які адбыўся на базе прадпрыемства, гэта найважнейшае пытанне для развіцця сельскай гаспадаркі і экалогіі абмяркоўвалася дэталёва і на перспектыву.

Фота БелТА.

«ГАЛОЎНАЕ, КАБ БЫЛО НАДЗЕЙНА»

Перад тым як заслухаць даклад аб стане і перспектывах развіцця ААТ «Амкадор» — кіруючая кампанія холдынга», Прэзідэнт пацікавіўся ў кіраўніцтва прадпрыемства, ці хапае працоўнай сілы. Старшыня савета дырэктараў ААТ «Амкадор — кіруючая кампанія холдынга» Аляксандр Шакуцін паведаміў, што канкрэтна на «Амкадор-КЭЗ» працуюць 130 чалавек. Аднак, каб утрымаць людзей, іх неабходна забяспечыць жыллём. Аляксандр Лукашэнка спытаў, колькі кватэр неабходна, і ўнёс канкрэтную прапанову па вырашэнні жыллёвага пытання — ажыццяўляць сучаснае драўлянае домабудаванне. Па яго словах, інавацыйныя падыходы дазваляюць узводзіць дамы вышынёй да васьмі паверхаў.

Генеральны дырэктар ААТ «Амкадор» — кіруючая кампанія холдынга» Андрэй Яроцкі далажыў кіраўніку дзяржавы, што прадпрыемства развіваецца ўстойліва, працуе з прыбыткам і плануе нарошчваць інвестыцыі. «Амкадор-КЭЗ» з'яўляецца адзіным у Беларусі вытворцам меліяратыўных машын і аднакаўшовых гідраўлічных экскаватараў на гусенічным і коламым ходзе, а таксама траншэякапальнікаў. На заводзе таксама ствараюцца бульдозеры, тэлескапічныя пагрузчыкі, ачышчальнікі каналаў і касілкі. Асаблівая ўвага беларускага лідара была скіравана на тэхніку для меліяратыўных работ. Прэзідэнт пераканаўся, што гэта грашовы кірунак, эканамічна выгадны, які неабходна развіваць. Гэтая тэхніка, па яго словах, запатрабавана не толькі ў нашай краіне, але і за мяжой, у тым ліку ў Расійскай Федэрацыі.

У той жа час кіраўнік дзяржавы паставіў задачу аднавіць сапсаваную тэхніку. Прастойванне, па яго словах, толькі з-за таго, што нейкія камплектуючыя з'яўляюцца імпартнымі, быць не павінна. На прадпрыемстве беларускага лідара запэўнілі: нашы людзі здольныя зрабіць усё. Што датычыцца «Амкадор-КЭЗ», большасць камплектуючых — беларуска-расійскай вытворчасці. Там, дзе ёсць праблемы, вытворчасць асвойваюць самі.

Пасля даклада аб развіцці холдынга і канкрэтнага прадпрыемства Аляксандр Лукашэнка пабываў у цэхах, дзе азнаёміўся з арганізацыяй вытворчасці тэхнікі, якая выпускаецца на прадпрыемстве. Кіраўніку дзяржавы, у прыватнасці, прадэманстравалі ўзоры машын, асноўных вузлоў і камплектуючых, створаных у рамках праграмы па імпартазамяшчэнні. Магчымасці меліяратыўнай тэхнікі ў дзейнасці былі паказаны на доследным палігоне. «Галоўнае, каб было надзейна», — заўважыў беларускі лідар.

СТАР. 2

На слыху

ПАПУЛЯРНАСЦЬ УНУТРАНАГА ТУРЫЗМУ РАСЦЕ

Але як знайсці цікавыя маршруты?

Што робіцца ў Беларусі для папулярызацыі ўнутранага турызму? Сёння, як сцвярджаюць прадстаўнікі турыстычнай справы, якраз гэты кірунак выклікае найбольшую цікавасць. І менавіта на яго накіраваны шэраг сацыяльных праектаў, якія рэалізоўваюцца ў Беларусі. Адзін з такіх — рэспубліканскі конкурс сацыяльнай рэкламы «#Пазнай Беларусь», які праходзіў у маі — верасні гэтага года. Усе ахвотныя маглі даслаць на адрас журы сваю работу ў трох намінацыях: «Слоган», «Плакат», «Відэаролік», прысвечаныя любому кутку Беларусі. Што з гэтага атрымалася, расказалі прадстаўнікі аргкамітэта конкурсу.

СТАР. 3

Экалагічная бяспека

ТЭХНАЛОГІІ З ПРЫСТАЎКАЙ «ПЕРА»

Пытанне раздзельнага збору другасных матэрыяльных рэсурсаў даўно ўзнімаюць эколагі ўсяго свету, імкнучыся данесці да людзей важнасць перапрацоўкі выкарыстанай тары. Мы даведаліся, дзе ў Віцебску атрымліваюць другое жыццё пластыкавыя бутэлькі і ў якім выглядзе яны вяртаюцца да спажыўцоў.

Фота «Віцебскія весткі».

У маі мінулага года ў горадзе на Дзвіне пачаў работу самы сучасны ў краіне смецесартавальны завод камунальнага аўтатранспартнага ўнітарнага прадпрыемства «Спецаўтабаза горада Віцебска». Дарэчы, паўночны рэгіён дагэтуль быў адзіным абласным цэнтрам, дзе не было падобнай сартавальна-перапрацоўчай установы. На будаўніцтва найноўшага смецесартавальнага комплексу было накіравана звыш 38 мільёнаў рублёў. У чым жа «фішка» завода, якая дае яму права называцца самым сучасным? Пра ўсё — па парадку.

СТАР. 4

«КОЖНЫ КАВАЛАК ТАКОЙ ЗЯМЛІ ПАВІНЕН БЫЦЬ ВЫКАРЫСТАНЫ НА КАРЫСЦЬ КРАІНЫ»

«МЕЛІЯРАЦЫЯ — АСНОЎНАЕ ЗВЯНО»

На базе ААТ «Амкадор-КЭЗ» кіраўнік дзяржавы правёў рэспубліканскі семінар-нараду па пытаннях аднаўлення і выкарыстання меліяраваных земляў у краіне.

«Мной прынята настойлівае, жалезнае рашэнне аб тым, што трэба меліярацыю ўзмацняць», — заявіў ён. Прэзідэнт ставіць пытанне больш шырока: гэта не толькі меліярацыя, але і культура земляробства. «Вядома, меліярацыя — асноўнае звяно, — кажучы аб культуры земляробства, удакладніў беларускі лідар. — Як бы ні было цяжка, за два-тры гады мы павінны рэалізаваць тыя планы, якія калісьці намецілі на дзесяць гадоў. Мы іх не выканалі, не выканаем і ў гэтым годзе, але я атрымаў запэўніванне ўрада і асабіста віцэ-прэм'ера, што на гэты год запланаваныя да меліярацыі плошчы будуць выкананы».

Асвоена больш за палову гэтых плошчаў. Астатнія павінны быць меліяраваны да канца года — такую задачу паставіў кіраўнік дзяржавы.

«ГЭТЫМ ТРЭБА ЗАЙМАЦЦА, І МЫ ЎМЕЕМ ГЭТА РАБІЦЬ»

Гаворачы аб культуры земляробства, Прэзідэнт звярнуў увагу на тое, што нямала занядбаных прысядзібных участкаў. І наваколле Мінска — не выключэнне. Гэтыя прысядзібныя ўчасткі, па яго словах, варта трымаць у парадку: «Іх трэба прыводзіць у нармальны стан і думаць, што там апрацоўваць. Нам неабходна ўвесці ў севазварот усе гэтыя прысядзібныя ўчасткі, і мы 100, 150 тысяч тон збожжа можам атрымаць за кошт гэтых земляў».

Яшчэ адно пытанне, якому ўдзяліў увагу беларускі лідар, — распрацоўка, разбор старых ферм. Нямала прыкладаў, калі пабудаваныя раней комплексы даўно не выкарыстоўваюцца, але як стаялі, так і стаяць. А на іх месцы, лічыць Прэзідэнт, можна вырошчваць сельскагаспадарчыя культуры. Такім чынам, пастаўлена задача знесці старыя пабудовы і ўвесці плошчы, на якіх яны стаяць, у севазварот.

«Можа, дзесьці і меліярацыя не патрэбна, але хмызняком зарастаюць сельскагаспадарчыя палі», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Прэзідэнт нагадаў, што меліярацыя і дарогі — галоўная задача. Зноў, па яго словах, даводзіцца вяртацца да таго, што дзяржава ўдзяляе ёй увагу. «Гэтым трэба займацца, і мы ўмеем гэта рабіць», — рэзюмаваў ён.

«ЗЯМЛІ МЫ ЎДЗЯЛЯЛІ МАЛА ЎВАГІ»

Вяртаючыся да тэмы аднаўлення і павышэння эфектыўнасці выкарыстання меліяраваных земляў, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што далей цягнуць нельга. Па яго словах, як ва ўмовах ваеннага часу, трэба загрузіцца і вырашыць праблему — для гэтага ў нас ёсць усё.

На сёння плошча меліяраваных земель у Беларусі складае 37 % ад усіх сельгасугоддзяў, гэта амаль тры мільёны гектараў. Асноўная частка (80 %) сканцэнтравана ў Брэсцкай, Віцебскай, Гомельскай і Мінскай абласцях. На гэтых землях вырабляецца трэцяя частка раслінаводчай прадукцыі, у тым ліку больш за палову зялёных кармоў, неабходных для жывёлагадоўлі. «Таму пытанне — быць ці не быць меліярацыі ў Беларусі? — сёння, як я ўжо сказаў, нават не абмяркоўваецца, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Маё найжорсткае патрабаванне застаецца ранейшым: кожны кавалак такой зямлі павінен быць выкарыстаны на карысць краіны».

Аляксандр Лукашэнка расставіў прыярытэты ў гэтым напрамку і абазначыў асноўныя моманты. У краіне, па яго словах, на пачатак пяцігодкі налічвалася 412 тысяч гектараў раней меліяраваных земляў, што знаходзяцца ў занядбаным стане. «Кажучы простай мовай, з-за безгаспадарлівасці яны ператварыліся ў зарослыя хмызняком канавы і балоты, — заўважыў ён. — Аднак і мы ў гэтым вінаваты, што не ўдзялялі ўвагі: глядзелі, як бы нам паболей збожжа атрымаць, малака, мяса. Мы забыліся пра галоўнае: хто прыносіць гэтыя грошы, — сельская гаспадарка: людзі і зямля. Зямлі мы ўдзялялі мала ўвагі».

У 2021 годзе ў сельгасабарот удалося вярнуць усяго толькі 27,5 тысячы гектараў. Ураду сумесна з аблвыканкамамі пастаўлена задача ў 2022 годзе падвоіць, а то і патроіць тэмпы работ. Тады, па меркаванні кіраўніка дзяржавы, мы выйдзем на патрэбныя тэмпы. «Прычым усе неабходныя рашэнні былі прыняты, — адзначыў ён. — Спрошчаны парадак вядзення меліярацыйных работ. З рэспубліканскага бюджэту ў гэты няпросты час адшукалі дадатковыя 66 мільёнаў рублёў на асноўныя работы. Яшчэ 15 мільёнаў выдзелілі на закупку айчыннай меліярацыйнай тэхнікі і абсталявання».

Пры гэтым Прэзідэнт папярэдзіў: кожная капейка павінна быць на ўліку, легкадумна да гэтага ставіцца нельга. Кантроль будзе жорсткі. «Хопіць разбазарваць грашовыя сродкі, закопваць іх у зямлю, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Тое самае і па тэхніцы. Усё пралічым: затраты, сабекошт. Лішніх грошай няма. Прыкладаць намаганні і ўкладвацца давядзецца ўсёй краіне».

Прынятыя ўрадам меры па меліярацыі дазволяць у 2022 годзе вярнуць у сельскагаспадарчы абарот амаль 55 тысяч гектараў зямлі. Да 1 лістапада асвоена толькі 31 тысяча гектараў або крыху больш за палову ад абяцанага. Да канца года засталося менш за два месяцы. «Мяне насцярожвае такое стаўленне, — заўважыў беларускі лідар. — Тым больш, як дакладвае Камітэт дзяржкантролю, існуючыя праблемы і недахопы, а таксама факты безгаспадарлівасці з году ў год паўтараюцца».

Прэзідэнт абазначыў толькі асноўныя моманты. Першае. 20 раёнаў краіны ліквідавалі свае арганізацыі, якія адказвалі за меліярацыю (у Віцебскай вобласці — 5 раёнаў, Гродзенскай — 5 раёнаў, Магілёўскай — 7 раёнаў). Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што калі дастаткова на два раёны адной ПМК, то і хопіць гэтага. «Паглядзіце аптымальна на тыя плошчы, якія мы будзем аднаўляць і, магчыма, дзесьці будзем дадаткова весці меліярацыю», — паставіў задачу кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка канстатаваў: пайшоў адток і супрацоўнікаў, асабліва працоўных спецыяльнасцяў. «За шэсць гадоў колькасць работнікаў зменшылася на 3,6 тысячы чалавек, або амаль на 30 %. Без людзей нічога не зробім, — падкрэсліў ён. — Тэхніка дарагая. Галоўнае — падрыхтаваць добрага спецыяліста».

У сувязі з гэтым пажаданне Прэзідэнта — каб у людзей было жыллё. «Але ўсё павінна быць пад кантролем», — перакананы ён. Размова ў першую чаргу ідзе пра арэнднае жыллё. Людзі, па словах кіраўніка дзяржавы, павінны разумець: працуеш — жывеш, не працуеш — да пабачэння.

«БЯЗЛАДДЗЕ НЕДАПУШЧАЛЬНА»

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу і на праблему зношвання меліярацыйнай тэхнікі. «Ёсць факты прастою па паўтара года з-за рамонтных работ, — прывёў прыклад ён. — Найбольш вострая сітуацыя — у Віцебскай і Магілёўскай абласцях. Думайце, як аднавіць старую тэхніку, трэба правесці рэвізію. Няхай кіраўнік адкажа, чаму пад плотам стаіць гэтая дарагая тэхніка. Усіх страсянём, і кожны адкажа».

Фота БелТА.

Акцэнтаваў увагу кіраўнік дзяржавы і на тым, што ў апошнія гады рэзка ўпала якасць работ, што натуральна на фоне такога стаўлення да справы. «Непрывабныя прыклады працягваюць выяўляцца ва ўсіх прывесці ў пачуццё. І ўрад, і аблвыканкамы. Я не пагражаю, але сітуацыя такая, што людзі рэдка разумеюць добрае слова і тыя задачы, якія ставяцца ў спакойным рэжыме».

Па перакананні Прэзідэнта, сёння неабходна вырашаць, як павялічыць аб'ёмы работ, знайсці крыніцы фінансавання, забяспечыць тэхнічнае перааснашчэнне профільных прадпрыемстваў. А яшчэ — узмацніць адказнасць за зробленае і нязробленае. «Праблемы ў гэтай сферы дасягнулі крытычнага ўзроўню, — лічыць ён. — Яшчэ 5–7 гадоў — і вярнуцца да гэтых праблем будзе немагчыма. У нас не будзе вялізных сродкаў, каб наноў праводзіць меліярацыю».

У сувязі з гэтым пастаўлена яшчэ адна задача — эксплуатацыя і рэканструкцыя ўжо пабудаваных меліярацыйных сістэм. Іх у нас без малога пяць тысяч.

«Мы бачылі сёння на «Амкадоры»: уся лінейка тэхнікі вырабляецца ў краіне, — адзначыў беларускі лідар. — Ні ад якага імпарту і санкцый мы не залежым. Гэта ўжо палова справы. Да таго ж захаваны Інстытут меліярацыі ў сістэме Акадэміі навук Беларусі. Ён займаецца распрацоўкамі навуковага суправаджэння меліярацыйных работ, павышэннем эфектыўнасці абслугоўвання меліярацыйнай сеткі. Вучоны, як ніхто іншы, павінен растлумачыць усім выгаду меліярацыі. Гэта ж не дурнота нейкая. Тэрмін акупнасці праектаў рэканструкцыі асушальных сістэм складае ад 9 да 12 гадоў. Але так было ва ўмовах 2019—2020 гадоў. Пры цяперашніх цэнах, у тым ліку на зерне і перш за ўсё на зерне і з улікам штогадовага прыросту па аб'ектах меліярацыі, якія рэканструююцца (мінімум плюс 40 цэнтнераў кармавых адзінак з гектара), гэтая акупляльнасць усіх затрат паменшыцца да 3–4 гадоў. Любы бізнесмен возьмецца за такі праект».

Прадстаўнікі ўрада, губернатары, кіраўнікі прадпрыемстваў далажылі, што будзе зроблена для выканання запланаваных аб'ёмаў па меліярацыі зямель, а таксама для выхаду на стабільную і эфектыўную работу меліярацыйнага комплексу краіны. Былі абмеркаваны, выпрацаваны канкрэтныя рашэнні, каб у першую чаргу была рэальная эканамічная аддача ад гэтых укладанняў і праведзеных мерапрыемстваў.

Напрыканцы рабочай паездкі кіраўнік дзяржавы незапланавана наведаў прыватную вытворчасць па будаўніцтве драўляных дамоў. Праект, на думку Прэзідэнта, перспектыўны. Аляксандр Лукашэнка паабяцаў разгледзець пытанне аб яго фінансавай падтрымцы.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

* * *

Пасля семінара-нарады Прэзідэнт адказаў на пытанні журналістаў

ПРА ЦЭНЫ І ЧЫНОЎНІКАЎ

Адно з пытанняў датычылася дакументаў, якія рэгулююць цэнаўтварэнне. Была прынята Дырэктыва Прэзідэнта, уступіла ў сілу і пастанова ўрада. Якіх з гэтых дакументаў трэба прытрымлівацца суб'ектам гаспадарання.

«Дырэктыва Прэзідэнта — гэта святое, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Ніхто не можа адмяніць указанне Прэзідэнта. Яна не супярэчыць пастанове. Дырэктыва датычылася неадкладнай замарозкі цэн да таго, як будзе прынята пастанова ўрада. Пастанова ўрада прынята, дырэктыва выканана. Далей дзейнічае пастанова ўрада, якая ўвяла сістэму цэнаўтварэння. Вось і ўсё. Усё! Няма патрэбы ў Дырэктыве, яна выканана».

У Прэзідэнта пацікавіліся, ці змянілася ў яго за апошнія некалькі гадоў стаўленне да таго, якім павінен быць беларускі чыноўнік топ-узроўню. «Нічога новага, — заўважыў Аляксандр Лукашэнка. — Адзінае, што я і патрабую ўвесь час: дысцыпліна і парадак. І сістэма. Ёсць сістэма. Яна павінна працаваць, і яна павінна быць дысцыплінаваная і ў парадку». Гэтага кіраўнік дзяржавы патрабуе і ад губернатараў, і прадстаўнікоў урада, і ўсіх падпарадкаваных. «Будзе гэта — будзе працаваць эканоміка, — падкрэсліў беларускі лідар. — Будзе працаваць эканоміка — ніколі не будзе вайны».

«ПАКУЛЬ СІСТЭМА СПРАЎЛЯЕЦЦА»

Падрабязна Прэзідэнт спыніўся на сістэме работы органаў сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва і Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва. Напярэдадні кіраўнік дзяржавы заслухаў даклад аб удасканаленні работы Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва і мерах па ўзмацненні падтрымкі пенсіянераў. У прыватнасці, была агучана прапанова аб'яднаць у адным дзяржаўным органе поўнасцю ўвесь цыкл пенсіённага і сацыяльнага страхавання. Гэта значыць, каб працэсы прызначэння, выплаты пенсій і дапамог, а таксама крыніца іх фінансавання знаходзіліся ў падпарадкаванні адной структуры — Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва. Цяпер яны падзелены паміж фондам і ўпраўленнямі сацабароны пры мясцовых органах улады, больш вядомых як «сабесы». Кіраўнік дзяржавы прапанаваныя навацыі не падтрымаў.

Сваю пазіцыю па гэтым пытанні ён выказаў у размове з журналістамі. Аляксандр Лукашэнка лічыць правільным, што ў свой час было прынята рашэнне акумуляваць пенсіённыя сродкі ў Фондзе сацабароны. Правільным, па яго словах, было і рашэнне стварыць казначэйства, дзе канцэнтруюцца бюджэтныя сродкі. «Калі казаць вобразна, то ў ФСАН, як у мяшку, назапашваюцца ўсе паступленні для наступных выплат пенсій і дапамог, — заўважыў беларускі лідар. — Што прапанавалі? Да гэтага мяшка ўсе райсабесы ўзяць з раёнаў і перадаць у фонд. Фонд ніякай уладай практычна не валодае. І ўвогуле гэта будзе нейкае змешванне».

Прэзідэнт звярнуў увагу на тое, што ўпраўленні і аддзелы сацыяльнай абароны пры рай- і аблвыканкамах — гэта вялікія структурныя падраздзяленні, дзе працуе шмат людзей. На іх дапамогу і ўдзел у грамадскіх мерапрыемствах, дадатковых сельгасработах пры неабходнасці можа разлічваць кіраўнік рэгіёна. «Калі «сабесы» вывесці з падпарадкавання мясцовых органаў улады і аддаць у структуру ФСАН, як гэта паўплывае на кіравальнасць усімі працэсамі? — задаў слушнае пытанне кіраўнік дзяржавы. — З Мінска нехта будзе там глядзець, як гэты аддзел працуе? Дзеля чаго? Каб было ў адных руках, грошы сабралі і з гэтага мяшка будуць размяркоўваць і прызначаць? Дык яны, «сабесы», і цяпер размяркоўваюць і прызначаюць».

Прэзідэнт перакананы: няма неабходнасці ламаць гэтую сістэму. «У нас ёсць самы кансерватыўны слой нашага насельніцтва — ветэраны, пенсіянеры, — удакладніў ён. — Дык няхай працуе гэтая кансерватыўная сістэма, яна праверана жыццём».

Не пагадзіўся беларускі лідар і з прапановай перайсці на лічбавыя працоўныя кніжкі. І адна з галоўных прычын — пытанне гарантавання бяспекі алічбаваных даных. Ініцыятыву поўнай алічбоўкі працоўных кніжак і адмовы ад папяровых варыянтаў кіраўнік дзяржавы лічыць вельмі несвоечасовай. Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што не бачыць нічога дрэннага ў існаванні звычайных папяровых працоўных кніжак, тым больш што для многіх людзей старэйшага пакалення вельмі важна мець менавіта папяровы дакумент. «Мы дамовіліся, што паступова, год за годам усё алічбуем, — рэзюмаваў Прэзідэнт. — Не трэба тут рэвалюцыйных узрушэнняў. Па некаторых напрамках, дзе меркавалася кардынальна мяняць сістэму сацыяльнага забеспячэння, я не палічыў неабходным гэта рабіць. Пакуль сістэма спраўляецца. Навошта? Прыйдзе час — паглядзім яшчэ раз на гэта».

Вераніка КАНЮТА,
Талачынскі раён.

Прыемная навіна

У АЗЯРЦЫ АДКРЫЛАСЯ НОВАЯ ПАЛІКЛІНІКА

У аграгарадку Азярцо Мінскага раёна расчыніла дзверы новая паліклініка, разлічаная на 200 наведванняў у змену. Пры праектаванні і будаўніцтве медыцынскай установы выкарыстаны сучасныя падыходы да дызайну і адпаведныя будаўнічыя тэхналогіі, якія дазволілі стварыць спрыяльнае асяроддзе для пацыентаў. На першы погляд, трохпавярховы будынак не ўражвае маштабамі. Але ўнутры ўсё прадумана да драбніц: прасторна, утульна, кампактна размешчаны кабінеты.

— Вельмі ўдалы атрымаўся аб'ект. Адразу відаць, што добра папрацавала праектная арганізацыя, у ходзе будаўніцтва ўносіла карэктывы. З пункту гледжання функцыянальнасці будынак блізкі да ідэальнага, — падкрэсліў **старшыня Мінаблвыканкама Аляксандр ТУРЧЫН**, які прыняў удзел ва ўрачыстай цырымоніі адкрыцця медыцынскай установы.

Аб новай паліклініцы жыхары аграгарадка марылі даўно. Населены пункт развіваецца, з кожным годам павялічваецца колькасць насельніцтва. У Азярцы працавала старая амбулаторыя, якая не магла прыняць усіх пацыентаў. Людзі вымушаны былі звяртацца па медыцынскую дапамогу ў Мінск або ў камерцыйныя медцэнтры.

— Паліклініка будзе аказваць пярвічную (урачы агульнай практыкі, педыятры) і спецыялізаваную медыцынскую дапамогу жыхарам 10 населеных пунктаў Шчомысліцкага і Хацежынскага сельскіх Саветаў. Тут пражывае больш чым шэсць тысяч чалавек, радыус абслугоўвання — 15 кіламетраў, — распавяла **загадчыца Азярцоўскай паліклінікі Кацярына МАРЦІНОВІЧ**. — Акрамя таго, будзем абслугоўваць пацыентаў, якія замацаваны за Навасельскай, а таксама Хацежынскай амбулаторыямі. А гэта ў агульнай колькасці 16 тысяч чалавек.

У новай паліклініцы пацыенты змогуць атрымаць кваліфікаваную меддапамогу па трынаццаці спецыяльнасцях. У тым ліку акушэрстве і гінекалогіі, афтальмалогіі, неўралогіі, хірургіі, атарыналарынгалогіі, стаматалогіі, педыятрыі. Змогуць прайсці таксама рэнтгеналагічную, ультрагукавую, лабараторную, функцыянальную дыягностыкі, фізіятэрапію.

Усе рабочыя месцы абсталяваны высокапрадукцыйнымі камп'ютарамі, аргтэхнікай, спецыялізаваным медыцынскім праграмным забеспячэннем. Укаранёны тэхналогіі электроннага рэцэпта і электроннай медыцынскай карты. Чалавек можа ўзяць таксама электронны талон да ўрача без зваротаў у рэгістратуру. Створаны працэдурны кабінет і кабінет дзённага знаходжання. А для медперсаналу прадугледжана ўтульнае памяшканне для адпачынку, абсталяванае канапамі, трэнажорамі, настольнымі гульнямі.

Аляксандр Турчын уручыў загадчыцы паліклінікі сертыфікат на 20 тысяч рублёў.

Кіраўнік цэнтральнага рэгіёна канстатаваў, што Мінскі раён — адзін з самых густанаселеных. Тут з кожным годам павялічвалася колькасць насельніцтва, паколькі інтэнсіўна будавалася жыллё. А вось інфраструктура ў сферы адукацыі, аховы здароўя адставала. «Цяпер наганяем: кожны год будуем школы, дзіцячыя садкі. Неабходна, каб Мінскі раён набыў глянец прысталічнага рэгіёна. Для гэтага мы прыкладзём усе намаганні, каб дасягнуць намечанага ў максімальна сцісłыя тэрміны, — запэўніў Аляксандр Турчын. — У найбліжэйшы час з'явіцца паліклініка ў Бараўлянах, новае прыёмнае аддзяленне ў Мінскай раённай цэнтральнай бальніцы, у наступным годзе — паліклініка ў Заслаўі. Мяркую, што ў 2023-м разам з гарадам пачнём узвядзенне паліклінікі ў Смалявічах. Да таго ж будзем весці капітальны рамонт, набываць медыцынскае абсталяванне ў абласную і раённыя бальніцы».

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

ПАПУЛЯРНАСЦЬ УНУТРАНАГА ТУРЫЗМУ РАСЦЕ

НОВЫЯ МАРШРУТЫ — АД НЕПРАФЕСІЯНАЛАЎ

Бясспрэчна, што інфармацыйнае прасоўванне з'яўляецца адным з галоўных складнікаў у турызме. І найлепшыя работы конкурсу па сацыяльнай рэкламе якраз будуць выкарыстоўвацца для папулярызацыі маршрутаў па Беларусі.

— Нядаўна мы зацвердзілі новыя ролікі па розных відах турызму для дэманстрацыі і прасоўвання як унутры краіны, так і за мяжой. Але добра мець не толькі прафесійныя працы, якія мы выкарыстоўваем на канферэнцыях і сімпозіумах. Для нас важна, каб у стварэнні прынялі ўдзел беларусы — як прафесіяналы, так і непрафесіяналы. Нас парадавала, што ў конкурсе прынялі ўдзел вельмі шмат дзяцей з розных навучальных устаноў, — адзначыла **дырэктар Дэпартамента па турызме Міністэрства спорту і турызму Ірына ВАРАНОВІЧ**.

Лічба ўдзельнікаў конкурсу сацыяльнай рэкламы таксама ўнушальная — пададзена больш за 500 заявак. Дарэчы, столькі ж удзельнікаў і ў рэспубліканскай акцыі «Вандруй. Адчуй. Натхняйся». У конкурсах былі прадстаўлены ўсе рэгіёны Беларусі.

— І, як і летась, больш за ўсё заявак паступіла з Гродзенскай вобласці, другое месца займае Гомельшчына. Актыўнасць жыхароў гэтых рэгіёнаў вельмі высокая, — падкрэсліла Ірына Варановіч. — Ад іншых абласцей хацелася б такой жа актыўнасці. Магчыма, хтосьці яшчэ прыглядаецца да нашага конкурсу і прыме ўдзел на наступны год. Уразіла разнастайнасць падачы, асабліва ў дзяцей. Яны знаходзяць такія формы, якія здзіўляюць нават дарослых. Напрыклад, мы бачым у 9-гадовым хлопчыку ўсе задаткі прафесійнага экскурсавода.

Большасць слоганаў удзельнікі стварылі на беларускай мове. Сярод відэматэрыялаў палова таксама была на роднай мове.

— Работы пераможцаў мы мяркуем выкарыстоўваць: размесцім плакаты, прычым не толькі ў Мінску, але і ў іншых гарадах, будзем трансліраваць відэаролікі — гэта важна для заахвочвання турыстаў падарожнічаць па сваёй краіне, — дадала Ірына Варановіч.

Акрамя таго, работы-пераможцы будуць размешчаны на сайце Нацыянальнага агенцтва па турызме і яго YouTube-канале, а таксама ў якасці сацыяльнай рэкламы на нацыянальным тэлебачанні. А некаторыя конкурсныя заяўкі стануць асновай для стварэння новых турыстычных маршрутаў.

ДЭФІЦЫТ ІНФАРМАЦЫІ ПРА МАЛАВЯДОМЫЯ МЯСЦІНЫ

Як адзначыў **дырэктар Нацыянальнага агенцтва па турызме Дзмітрый МАРОЗАЎ**, журы конкурсу было складана выбіраць паміж работамі дзяцей і прафесіяналаў з музейных устаноў ці прамысловых прадпрыемстваў. Пры гэтым адна справа — расказаць пра Мірскі ці Нясвіжскі замак, Косаўскі палац, і зусім іншая — стварыць паўнавартасную работу пра невялічкі населены пункт, дзе не так шмат гісторыка-культурнай спадчыны.

Шэраг работ былі ўдастоены спецыяльных прызоў, бо яны прысвечаны тэматыцы Года гістарычнай памяці.

— Такія работы і тэмы мы выкарыстаем на інфармацыйных шчытах, якія размяшчаюцца ў якасці сацыяльнай рэклямы для раскрыцця турыстычнага патэнцыялу таго ці іншага раёна горада. У Мінску існуе некалькі зацверджаных Нацыянальным агенцтвам па турызме маршрутаў: па тэрыторыі Мінскага гета, лагераў «Трасцянец» і «Масюкоўшчына». Было б нядрэнна адлюстраваць на сацыяльных плакатах па гэтых маршрутах і іншыя мясціны.

Намеснік начальніка ўпраўлення электронных СМІ і інтэрнэт-рэсурсаў Міністэрства інфармацыі Галіна ГУСАКОВА звярнула ўвагу, што цяпер існуе вялікі попыт на інфармацыю па ўнутраным турызме.

— Перад выхаднымі назіраецца цікавасць да варыянтаў адпачынку, каб далёка не ехаць і паболей убачыць, асабліва летам і ў добрае надвор'е. Што датычыцца СМІ, ва ўсіх дзяржаўных выданнях маюцца адпаведныя раздзелы ці тэматычныя старонкі, прысвечаныя турызму. Спецыялізаваныя інтэрнэт-рэсурсы імкнуцца ахапіць усё больш і больш, але адчуваецца недахоп інфармацыі ў адносінах да малавядомых куткоў нашай краіны, — расказала Галіна Гусакова.

ШЛЯХ ДА СЭРЦА ГОСЦЯ — ПРАЗ НАЦЫЯНАЛЬНУЮ КУХНЮ

Адным з актуальных кірункаў турызму з'яўляецца гастранамічны. Пра яго развіццё ў нашай краіне расказаў **начальнік упраўлення міжнароднага супрацоўніцтва і прымянення мер нетарыфнага рэгулявання Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю Яўген БЯЛОЎ**.

Асноўнай мэтай гастранамічнага турызму з'яўляецца знаёмства з той ці іншай краінай праз нацыянальную кухню. У Беларусі праводзіцца шэраг мерапрыемстваў, накіраваных на развіццё і папулярызацыю беларускай нацыянальнай кухні, развіццё зон гастратурызму, фарміраванне турыстычных маршрутаў з гастранамічным складнікам, а таксама прасоўванне гастранамічнага патэнцыялу Беларусі, у тым ліку і праз удзел у міжнародных турыстычных выставах.

У краіне працуе 446 аб'ектаў гастратурызму, з іх 73 спецыялізуецца на стравах беларускай кухні. Сярод папулярных мерапрыемстваў, накіраваных на папулярызацыю гастранамічнага турызму, — «Мотальскія прысмакі» ў Іванаўскім раёне, «Бульба-фэст» у Віцебску, «Браслаўскія зарніцы», «Юраўскі карагод».

— Расце колькасць турыстычных маршрутаў з гастранамічным складнікам, цяпер іх 75, у тым ліку тры распрацавана летась. Ідзе работа па правядзенні дзён беларускай культуры, майстар-класаў па прыгатаванні беларускіх страў, развіцці рэстаранаў і сетак грамадскага харчавання з нацыянальным каларытам, такія як «Васількі», «Гараж», «Літвіны», — адзначыў Яўген Бялоў.

Распрацоўваюцца і рэгіянальныя мабільныя дадаткі. Пакуль іх чатыры: «Мой горад» у Оршы і Полацку, «Гродна-гід», «М-6», які дзейнічае на аднайменнай аўтадарозе. Хутка з'явяцца два новыя: «Гомель-трэвэл» для Гомельскай вобласці і «Гродна-Р» — для Гродзенскай.

Алена КРАВЕЦ.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

ТЭХНАЛОГІІ З ПРЫСТАЎКАЙ «ПЕРА»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Установа абслугоўвае горад і Віцебскі раён, у перспектыве — пашырэнне тэрытарыяльнага ахопу насельніцтва: Гарадоцкі, Шумілінскі і Лёзненскі раёны вобласці. Вытворчыя магутнасці прадпрыемства дазваляюць сартаваць каля 100 тысяч тон адходаў за год, дзённая норма — каля 200 тон. Адна за адной машыны прыбываюць на тэрыторыю завода, праходзяць праз вагі і выгружаюць смецце ў бункер.

Сярод галоўных другасных матэрыяльных рэсурсаў — шкло, метал і папера, іх сарціроўка да сёння застаецца праблемай. Рэч у тым, што культура раздзельнага збору смецця дагэтуль у нас не прыжылася, нягледзячы на спецыяльныя каляровыя кантэйнеры, рознага кшталту сацыяльную рэкламу і грунтоўныя разважанні эколагаў. На спецаўтабазе былі і спецыяльныя машыны, прыстасаваныя да раздзельнага збору, але ўсё часцей у паперы з'яўлялася шкло і наадварот. Калі б кожны чалавек ставіўся сумленна да такога пытання сусветнай важнасці, працэс сарціроўкі на заводзе адбываўся б хутчэй, што дазволіла б перапрацоўваць больш.

Пасля бункера смецце адпраўляецца на стужку, дзе работнікі завода ўручную выбіраюць буйнагабарытныя прадметы, якія могуць пашкодзіць абсталяванне. Наступны тэхнічны працэс называецца арганічным адсевам, яго ажыццяўляе вялікі барабан з дзіркамі, праз якія адсейваюцца харчовыя адходы, яны спрасоўваюцца і накіроўваюцца на кампаставую пляцоўку, дзе перагніваюць. Арганічнаму кампаненту таксама знайшлі прымяненне: каля завода знаходзіцца палігон бытавых адходаў, дзе рэгулярна праводзяцца захаванні, кожны слой смецця павінен перасыпацца кампостам, ім пасыпаюць і схілы смеццевых гор.

Ужо пасля арганічнага адсеву надыходзіць час аўтаматызаваній сістэмы: магнітныя сепаратары прыцягваюць металічныя рэчы, магутнасць абсталявання дазваляе з агульнага рада «вычапіць» найдрабнейшыя металічныя часткі, але і тут без чалавечых рук не абысціся. Напрыклад, сепаратар прыцягвае балоны ад дэзадарантаў і асвяжальнікаў, у якіх ёсць пластыкавыя і гумавыя часткі, што затым аддзяляюць уручную, або старыя цвікі ў пакеце, які таксама трэба адсартаваць ад металаў. Аптычная ўстаноўка выдзімае лёгкія адходы.

Фота «Віцебскія вести».

Шрэдар — прыстасаванне для драбнення драўніны, якое пераўтварае яе ў шчэпкі. Прычым да працэсу дапускаецца толькі чыстае дрэва: астаткі ад лесанарыхтоўкі, пні, тоўстыя галіны, а вось, напрыклад, часткі мэблі, якая зроблена з прасаванага пілавіння з дабаўленнем клею і лакафарбавых вадкасцяў, не падыходзяць. Шчэпкі, якія з'яўляюцца гатовым прадуктам перапрацоўкі, рэалізоўваюць і выкарыстоўваюць для ацяплення завода.

Завод адсартоўвае металы, ПЭТ-бутэлькі, пластыкавыя ўпакоўкі ад мыйных сродкаў, поліпрапіленавыя мяшкі, кардон, тэтрапакі, каляровыя металы (напрыклад, алюмініевыя бляшанкі), жалеза. У перспектыве — асваенне сарціроўкі і перапрацоўкі латкоў з-пад яек, але тут галоўнай праблемай з'яўляецца паступленне адходаў такога тыпу ў брудным стане, што значна ўплывае на працэс перапрацоўкі. Цікавы момант з тканінамі розных відаў: яны паступаюць на завод, але знайсці ім далейшае прымяненне нельга — вяртаемся да пытання неразумення грамадзянамі важнасці раздзельнага збору. Адзенне, якое выкідваюць людзі, змешваецца з харчовымі адходамі ды іншымі брудамі матэрыяламі і прыходзіць на завод у нікчэмным стане, а перапрацоўваць брудную тканіну, каб гэта давала эканамічны вынік, пакуль не навучыліся.

Нягледзячы на тое, што аўтаматызаваная сістэма вылучае пластыкавыя або, як любяць казаць на заводзе, ПЭТ-бутэлькі, усе яны рознымя, і каб атрымаць пэўную прадукцыю пасля перапрацоўкі, іх трэба адсартаваць па чатырох відах: празрыстая і каляровая, з тонкага або цвёрдага пластыку. Пасля адбору яны паступаюць на склад, потым праходзяць дэзапрацоўку і адпраўляюцца на лінію, з якой выходзяць у выглядзе «флексы» празрыстай або каляровай. «Флекса» — гэта кавалачкі пластмасы дробнай фракцыі, якія потым вяртаюцца да спажыўцоў... у куртках-пухавіках. Другасная сыравіна пад уздзеяннем высокіх тэмператур пераплаўляецца ў масу, з якой атрымліваюць нітку, а яна ўжо становіцца асновай сінтэпону, якім набіваюць пухавікі, мяккія цацкі і не толькі.

Цяпер вядуцца пусканаладачныя работы па вытворчасці гранул з поліэтыленавай плёнкі, першыя вынікі атрымання прадукцыі з другаснай сыравіны ўбачыла і я. Маленькія выпуклыя круглячкі атрымліваюць шляхам расплаўлення поліэтылену, які праходзіць праз своеасаблівае сіта, дзе гарачыя кроплі механічна абразаюцца і ахалоджваюцца. Потым гранула выкарыстоўваецца пры вырабе пластыкавых вядзёр, гаршчкоў для кветак і іншай палімернай тары. Вытворчыя магутнасці завода разлічаны толькі на два працэсы: сарціроўку, якая ідзе няспынна, і выраб «флексы», шчэпак або гранул.

Што застаецца пасля паглыбленай сарціроўкі? Каля 50 працэнтаў астаткаў павінна выкарыстоўвацца на цэментных заводах як RDF-паліва, аднак не ўсе прадпрыемствы маюць спецыяльныя катлы для спальвання такіх прасаваных брыкетаў. Пакуль адходы, якія не падлягаюць далейшай перапрацоўцы, паступаюць на гарадскі палігон.

І, вядома, адказ на галоўнае пытанне, якое турбуе кожнага, хто не быў на тэрыторыі смеццесартавальнага завода, я знайшла таксама! Жудасных пахаў, ад якіх становіцца млосна, няма, некалькі хвілін — і нос звыкаецца з асяроддзем. Толькі, расказваюць работнікі, калі ідзе дождж або снег і смецце намакае, пахі становяцца ярчэйшымі. «Мясцовых жыхароў» завода, якія апынаюцца ў кучах з кантэйнераў, хапае таксама, да іх работнікі ўжо прывыклі. А пацукі, відаць, з-за добрага жыцця, ураважаюць сваімі памерамі. Але турбавацца і ўяўляць іх у выглядзе спрасаваных брыкетаў не трэба — грызуны жвава разбягаюцца са смеццевай кучы, калі набліжаецца пагрузчык. Бывалі выпадкі, калі на заводскай стужцы з адходамі «ехалі» і хатнія маленькія пацукі, аднак гэта былі гісторыі з добрым канцом: работнікі забіралі жывёлін у новую сям'ю. Нярэдка людзі прыязджаюць на завод шукаць у бязлічы адходаў выпадкова выкінутыя рэчы: грошы, ювелірныя ўпрыгажэнні, але мала каму шанцуе — аб'ёмы паступленняў занадта вялікія.

Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.

Энергетыка

ТРЫ «КІТЫ» АЙЧЫННАЙ ЭКАНОМІКІ:

энергаэфектыўнасць, клімат, лічбавізацыя

Яны імкнуцца зрабіць больш за іншых, каб свет быў устойлівым у расходаванні рэсурсаў, а асяроддзе — бяспечным. Так арганізатары рэспубліканскага конкурсу «Лідар энергаэфектыўнасці» характарызуюць удзельнікаў. Сёлета мерапрыемства праходзіла восьмы раз і сабрала неверагодную колькасць прыхільнікаў, а таксама займела новую традыцыю і асаблівую галіновую намінацыю.

Энергаэфектыўнасць, клімат, лічбавізацыя — базавыя «кіты», на якіх трымаецца і будзе трымацца ўся наша эканоміка, падкрэсліла **Вольга ПРУДНІКАВА, намеснік міністра энергетыкі**, уручаючы ўзнагароды пераможцам традыцыйнай конкурснай намінацыі «Энергаэфектыўны прадукт года»:

— Пытанні, звязаныя з кліматычнай тэмай, былі, застаюцца і будуць вельмі важнымі. На Зямлі не існуе такога месца, дзе можна было б схавацца ад найгоршых наступстваў кліматычных змен. Калі мы не будзем вырашаць пытанні энергазберажэння — наша эканоміка не будзе канкурэнтаздольнай. Калі мы не будзем укараняць лічбавыя тэхналогіі, то не будзем у трэндзе, не зможам кіраваць вытворчасцямі, адсочваць рух энергетычных патокаў. А выкарыстоўванне гэтых трох складнікаў дае сёння магчымасць прасоўваць самыя неверагодныя ідэі, ажыццяўляць іх і ўкараняць у вытворчасць.

Росквіт інавацыйных тэхналогій, у тым ліку ў сферы энерга- і рэсурсазберажэння, зрабіў сёлета самай папулярнай намінацыю «Энергаэфектыўная тэхналогія года», дзе пераможцам уручылі ажно 22 узнагароды.

— Вялікі сэнс конкурсу не толькі ў тым, што ствараюцца і ўкараняюцца новыя здабыткі, але яшчэ і ў тым, што ідзе ўзаемны абмен вопытам у розных сферах эканомікі, што паслужыць для развіцця краіны ў цэлым, — заўважыў падчас узнагароджання пераможцаў намінацыі **Вадзім КІЦІКАЎ, дырэктар інстытута жыллёва-камунальнай гаспадаркі НАН Беларусі**.

Конкурс — добрая пляцоўка, дзе можна павучыцца і пераняць вопыт энергаэфектыўнасці і энергазберажэння, каб зменшыць сабекошт сваёй прадукцыі і назаўжды замацавацца на рынках, куды Беларусь сёння пастаўляе сваю прадукцыю, падкрэсліў **Уладзімір ГРАКУН, намеснік міністра сельскай гаспадаркі і харчавання**, узнагароджваючы пераможцаў намінацыі «Энергаэфектыўныя будынкі і збудаванні, якія ўведзены ў эксплуатацыю»:

— Незалежна ад санкцый мы пастаўляем прадукцыю ў больш як 100 краін, і яе паўсюль пазнаюць, чакаюць, яна пацвярджае сваю якасць, то-бок беларуская прадукцыя — гэта і ёсць якасць.

Сёлета аргкамітэт у знак удзячнасці вырашыў ураганаваць «серыйных» пераможцаў, якія вядуць планамерную працу па ўсіх напрамках, што адзначана ва ўсіх намінацыях. То-бок калі нехта ўкараніў адзін-два праекты, то некаторыя на восьмы год конкурсу ўжо пераадолелі бар'ер у дзясятак узнагарод. Такім кампаніям вырашана прысуджаць залаты статус «Лідар энергаэфектыўнасці Рэспублікі Беларусь». Сёлета асаблівую падзяку атрымалі «Мінгаз» (18 перамог), «Віцебскаблгаз» (13) і «Мінскаблгаз» (11).

У якасці эксперымента арганізатары ўвялі таксама новую галіновую намінацыю, якая для ўсіх удзельнікаў гучыць аднолькава, — «Найлепшая кампанія года». Вызначаючы пераможцаў, журы арыентавалася на эканамічную эфектыўнасць рашэнняў, запатрабаванасць іх з боку спажыўцоў і магчымасць маштабавання вопыту. Сёлета найлепшымі ў намінацыі сталі шэсць кампаній.

Ірына СІДАРОК.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Лідары КНР і ЗША сустрэнуцца на саміце G20

Сі Цзіньпін і Джо Байдэн правядуць 14 лістапада двухбаковую сустрэчу на саміце G20 на Балі. Пра гэта паведаміла ТАСС са спасылкай на прэс-сакратара Белага дома Карын Жан-П'ер. Лідары абмяркуюць пытанні захавання і пашырэння лініі сувязі паміж краінамі, кіравання канкурэнцыяй паміж Вашынгтонам і Пекінам, сумеснай працы і кропак судакранання ў сферах, якія выклікаюць узаемную цікавасць. Сі Цзіньпін і Джо Байдэн абмяркуюць шырокі спектр рэгіянальных і глабальных тэм. Па словах афіцыйнага прадстаўніка знешнепалітычнага ведамства Кітая Чжаа Ліцзяня, КНР надае вялікае значэнне прапанове ЗША правесці сустрэчу кіраўнікоў дзвюх дзяржаў. Цяпер гэта стала прадметам перагавораў.

Нетаньяху атрымае мандат на фарміраванне ізраільскага ўрада

Лідар партыі «Лікуд» Біньямін Нетаньяху атрымае заўтра ад прэзідэнта Ізраіля Іцхака Герцага мандат на фарміраванне новага ўрада краіны. Аб гэтым паведаміла дзяржаўная тэлерадыёкампанія КАН. «Этап рэкамендацый завершаны. Прэзідэнт даверыць фарміраванне ўрада Нетаньяху ў нядзелю», — адзначаецца ў публікацыі. Герцаг пачаў кансультацыі з кіраўнікамі партый па фарміраванні ўрада па выніках выбараў у кнэсет 25-га склікання. Як вядома, ЦВК Ізраіля 3 лістапада паведаміў аб завяршэнні падліку галасоў, аддадзеных на выбарах у кнэсет, па выніках якіх блок экс-прэм'ера Нетаньяху атрымаў парламенцкую большасць у 64 галасы. Такім чынам, Нетаньяху можа сфарміраваць права-рэлігійную кааліцыю са сваімі традыцыйнымі партнёрамі, якая абапіраецца на парламенцкую большасць у 64 дэпутацкія галасы. У блока яго сапернікаў — 46 галасоў, яшчэ 10 — у арабскіх партый.

Еўропе прадказалі найцяжэйшую зіму з часоў Другой сусветнай вайны

Такой думкай падзяліліся эксперты Цэнтра развіцця энергетыкі, паведаміла РІА «Навіны». Спецыялісты лічаць, што толькі пры збегу дзвюх абставін — адносна цёплай зімы і стабільных паставак звадкаванага прыроднага газу — Еўропа зможа пазбегнуць маштабных адключэнняў прамысловасці або дырэктыўнага скарачэння спажывання газу. У Цэнтры развіцця энергетыкі ўдакладнілі, што, калі хоць бы адзін з гэтых фактараў не будзе выкананы, ёсць высокая рызыка сустрэць зімовы перыяд з недастатковымі запасамі энергарэсурсаў. Адзначаецца, што ў выпадку халадоў нават пры ўвядзенні сур'ёзных абмежаванняў на спажыванне запасы газу ў Еўрапейскім саюзе да канца зімы будуць на 20–25 млрд куб. м меншыя, чым трэба.



ЛАКАМАТЫЎ ПАЙШОЎ ПАД АДХОН

Чаму Германія ўжо не «хэдлайнер» Еўрасаюза?

У Германіі вырашылі забараніць банкам пакідаць фае адкрытымі з 23.00 да 6.00. Такая мера ўведзена з-за частых нападаў на банкаматы з выкарыстаннем узрыўчаткі. Як піша Bloomberg, зараз немцы не змогуць здымаць грошы ў банкаматах у фае банкаўскіх аддзяленняў па начах. «Урад вымушаны прыняць «эфектыўныя і агульнанацыянальныя прэвентыўныя меры», каб спыніць хвалю нападаў», — заявіла на сустрэчы з прадстаўнікамі банкаўскай індустрыі міністр унутраных спраў Германіі Нэнсі Фейзер. Паводле звестак улад, колькасць атак на банкаматы з выкарыстаннем выбуховых рэчываў вырасла са 111 у 2020 годзе да 250 летась, а па выніках бягучага года іх колькасць, хутчэй за ўсё, будзе яшчэ большай. «Рэзкае павелічэнне колькасці выбухаў банкаматаў, якія часта ўчыняюцца з выкарыстаннем небяспечных выбуховых рэчываў, пагражае жыццю трэціх асоб», — падкрэсліла міністр. Такія паведамленні яскрава адлюстроўваюць крызісныя з'явы ў нямецкім грамадстве, якія сталі вынікам калапсу ў эканоміцы. Колішні лакаматыў Старога Свету імкліва губляе сваю вагу. Чаму Германія ўжо не «хэдлайнер» Еўрасаюза?

ІНФЛЯЦЫЯ РАСПАЛІЛАСЯ ДАЧЫРВАНА

Немцам цяпер не пазайздросціш — рэдкі дзень у Германіі абыходзіцца без якога-небудзь прагнозу, у пераважнай большасці, негатыўнага. Шэраг з іх спрыяюць. Так, упершыню з моманту ўвядзення ў абарачэнне еўра больш як два дзесяцігоддзі таму ў верасні інфляцыя ў Германіі перавысіла 10 працэнтаў і ўшчыльную наблізілася да 11 працэнтаў. Упраўленне статыстыкі ФРГ Destatis падкрэсліла, што такой высокай інфляцыі ў краіне не было са снежня 1951 года. «Інфляцыя ў Германіі распалілася дачырвана», — вобразна пракаментаваў даныя Destatis эканаміст галандскага банка ING Карстэн Бржэскі. Найбольшы ўклад у рэкордны рост інфляцыі ў першы восеньскі месяц унеслі цэны на энергію і энерганосьбіты, якія ў параўнанні з вераснем мінулага года ўзраслі на 43,9 працэнта. Імкліваму рыўку інфляцыі таксама спрыялі праблемы з ланцужкамі паставак і іншыя прычыны.

Далей — больш. У кастрычніку спажывецкія цэны ў Германіі, гарманізаваныя са стандартамі Еўрасаюза, узраслі на 11,6 працэнта ў гадавым вызначэнні. Аб гэтым сведчаць папярэднія звесткі Федэральнага статыстычнага ўпраўлення краіны (Destatis). Тэмпы інфляцыі паскорыліся ў параўнанні з вераснем і зноў абнавілі гістарычны максімум. Апытаныя Trading Economics аналітыкі ў сярэднім чакалі захавання інфляцыі на ўзроўні папярэдняга месяца. Узмацненню інфляцыі ў ФРГ садзейнічаюць паслабленне еўра, энергетычны крызіс і праблемы ў ланцужках паставак, якія захоўваюцца. Цэны на энерганосьбіты ў краіне ўзраслі ў кастрычніку на 43 працэнты, прадукты харчавання падаражэлі на 20,3 працэнта, кошт паслуг павялічыўся на 4 працэнты.

РЭЦЭСІЯ НА ПАДЫХОДЗЕ

«Інфляцыя, рэцэсія, страта дабрабыту» — так красамоўна называецца восеньская справаздача вядучых эканамічных інстытутаў Германіі. З лакаматыва, які неаднойчы выцягваў у апошнія гады кантынент з крызісаў і рэцэсій, ФРГ ператвараецца ў цяжкі груз для еўрапейскіх краін, заўважае expert.ru. Сітуацыя ў Старым Свеце працягвае пагаршацца. Эканамісты, апытаныя агенцтвам

Bloomberg, якія яшчэ нядаўна прагназавалі эканоміцы еўразоны ў наступным годзе рост, цяпер істотна панізілі прагноз і чакаюць відавочны спад. Прычым на дно эканоміку зоны адзінай еўрапейскай валюты пацягне краіна, якую яшчэ нядаўна лічылі фінансавым апірышчам Старога Свету. У той час, як ад трох буйных еўрапейскіх эканомік — Францыі, Італіі і Іспаніі — эканамісты чакаюць нязначнага росту, першай на кантыненце эканоміцы — Германіі — яны прадказваюць спад.

Условия аукциона: победитель аукциона с условиями на право проектирования и строительства кап. строений (зданий, сооружений), либо единственному подавшему заявление на участие в таком аукционе юридическому лицу или индивидуальному предпринимателю, либо единственному явившемуся на такой аукцион юридическому лицу или индивидуальному предпринимателю: в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением документации, необходимой для его проведения; в течение 10 рабочих дней со дня подписания протокола, оформляемого по результатам аукциона, подписать акт выбора места размещения земельного участка; не позднее 2 рабочих дней после внесения платы за право заключения договора аренды земельного участка, возмещения затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением документации, необходимой для его проведения, заключить договор на реализацию права проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений); разработать проектно-сметную документацию в соответствии с действующими техническими нормативными правовыми актами и в сроки, определенные договором на реализацию права проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений); в сроки, определенные актом выбора места размещения земельного участка, представить в организацию по землеустройству генеральный план объекта строительства с проектируемыми инженерными сетями, разработанный в составе проектной документации, для разработки проекта отвода и установления на местности границы земельного участка в установленном порядке; осуществить строительство объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией и договором на реализацию права проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений); после принятия решения о предоставлении земельного участка обратиться за государственной регистрацией прекращения существования земельных участков, прав, ограничений (обременений) прав на них республиканского дочернего унитарного предприятия по обеспечению нефтепродуктами «Белоруснефть-Витебскоблнефтепродукт» и изменением границ земельного участка республиканского унитарного предприятия автомобильных дорог «Витебскавтодор»; при необходимости удаления, пересадки объектов растительного мира до начала строительных работ получить разрешение на проведение компенсационных посадок либо осуществление компенсационных выплат в соответствии с проектной документацией; произвести демонтаж опоры, расположенной на земельном участке с кадастровым № 225555100001002155. Расходы, связанные с изготовлением и предоставлением документации, необходимой для проведения аукциона (формирование земельно-кадастровой документации и оценка, изготовление градостроительного паспорта), составляют 3594,25 бел. руб. Информация об окончательных суммах затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходах, связанных с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, письменно доводится до сведения участников до начала проведения аукциона. Убытки, связанные с изъятием земельных участков и со сносом капитальных строений (зданий, сооружений) и потери сельскохозяйственного производства, пересчитываются при разработке проекта отвода земельного участка с установлением его границы на местности и возмещаются после принятия решения о предоставлении земельного участка. Рассрочка внесения платы за право заключения договора аренды земельного участка предоставляется в соответствии с Положением.

Для участия в аукционе приглашаются юридические лица и индивидуальные предприниматели, консолидированные участники – два и более индивидуальных предпринимателей, юридических лиц. Для участия в аукционе необходимо: в установленный в извещении срок подать заявление на участие в аукционе, представить документ, подтверждающий внесение суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении, с отметкой банка, заключить соглашение с организатором аукциона. Дополнительно представляется: юр. лицом РБ или индивид. предпринимателем – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юр. лица или индивид. предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юр. лицом – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение 6 месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык; представителем заявителя (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель) – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованная в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык. Консолидированными участниками для участия в аукционе представляются также оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юр. лица также – документ, подтверждающий его полномочия. При подаче документов уполномоченное лицо (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, и доверенности, выданные индивид. предпринимателями, юр. лицами, заключившими договор о совместном участии в аукционе. Всем желающим предоставляется возможность осмотра земельного участка, право проектирования и строительства кап. строений (зданий, сооружений), на которые предполагается предоставить по результатам аукциона, и ознакомления с документацией в отношении предмета аукциона. Информация об инженерных коммуникациях и сооружениях, инженерно-геологические условия, условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории отражена в АПЗ и технических условиях.

Конт. тел.: (0212) 24-63-12, (029) 510-07-63.
E-mail: vcm74@mail.ru, www.marketvit.by.

«КАЛІ Я НЕ БУДУ ЛЮБІЦЬ ТЭНІС, ГЭТА ЎЖО БУДУ НЕ Я»

Гісторыя спорту — з першых вуснаў

УЛАДЗІМІР УЛАДЗІМІРАВІЧ Тужыкаў, здаецца, ведае аб тэнісе ўсё. За сваё шматгадовае жыццё на корце ён быў спартсменам, трэнерам і суддзёй. А яшчэ ён рос і развіваўся разам з любімым спортам. Уладзімір Тужыкаў — прадстаўнік першага пакалення беларускіх тэнісістаў, якія і фарміравалі гэты від спорту. Ён ведае, як гуляць самымі простымі ракеткамі, гумовымі мячыкамі і на непрыдатных для тэніса пляцоўках. Бо менавіта так яны пачыналі гэтую вялікую спартыўную гісторыю. Уладзімір Тужыкаў ведае, па якіх правілах мусіць працаваць тэнісны суддзя, бо з'яўляецца адным з іх стваральнікаў. Ён — адзін з першых прафесійных тэнісных суддзяў у Беларусі. Патрыярх беларускага тэніса з ракеткай не расстаецца і з корта не сыходзіць. Бо гісторыя павінна працягвацца...

Як усё пачыналася...

Я стаў займацца тэнісам тады, калі ён толькі нараджаўся ў Беларусі. З хлопцамі з двара мы недзе даведаліся пра такую гульню і пачалі гуляць. Адзін з нашых дваровых тэнісістаў мой сябар Аркадзь Эйдэльман сёння вядомы трэнер. Мы самі выкапалі сабе пляцоўку, нацягнулі металічную сетку, зрабілі драўляныя ракеткі і пасля школы ўсім дваром гуляліў тэніс — на вуліцы Чырвонаармейскай у Мінску, дзе тады жылі. Можна сказаць, што менавіта там з'явіўся першы корт. Мячыкі ў нас былі гумовыя, а вельмі хацелася пагуляць сапраўднымі тэніснымі. Я быў самым маленькім, і мне даручылі выкрасці тэніснымі мяч. Нармальныя корты тады былі на стадыёне «Дынама» — агароджаныя плотам, а за ім раслі туі. Часам падчас гульні мячы выляталі за плот. Мне трэба было дачакацца такога моманту, схапіць мяч і прынесці яго сябрам. Я некалькі гадзін сядзеў за гэтымі туямі, чакаў мяча. Мяч прыляцеў. Шчасцю не было мяжы.

Спартыўных секцый для дзяцей тады практычна не было, тым больш па тэнісе. Трэнераў таксама было мала. Вось мы самі па сабе і гулялі. Але аднойчы ў Мінск прыехаў Генадзь Антонавіч Пятроў, за ім — Міхаіл Шаевіч Яноўскі. Пазней — і Марат Мікалаевіч Звераў. Вось гэтыя тры чалавекі і пачалі развіваць тэніс у Беларусі. Зусім маладыя, гадоў па 25. Але добрыя спецыялісты.

Аднаго дня я сказаў сябрам, што трэба ісці займацца тэнісам разам з трэнерам. Не маглі ж мы ўсё жыццё як дваровыя бадзягі гэтымі драўлянымі ракеткамі гуляць. Дамовіцца з трэнерам даручылі мне. І мы пайшлі на «Дынама», там было пяць летніх кортаў з нядрэнным на той час пясчаным пакрыццём. Якраз працаваў Міхаіл Шаевіч Яноўскі, ён усіх нас узяў. Яму нават не прыйшлося нікога набіраць — да яго моладзь ішла сама. Як дайшлі да яго брыгадай, так ён з намі і займаўся. Мы — першае пакаленне беларускіх прафесійных тэнісістаў. Адразу сталі ўдзельнічаць у турнірах, гуляць чэмпіянаты. Тэнісістаў было мала, а краіну трэба прадстаўляць. Мая першая паездка была ў Ленінград на зімовы чэмпіянат Савецкага Саюза. Наша дваровая «брыгада» амаль у поўным складзе ўвайшла ў зборную каманду БССР. А потым прыйшоў момант, калі трэба было заканчваць гуляць, тым больш ужо моладзь у спіну дыхала. А што робяць спартсмены пасля завяршэння кар'еры — пераходзяць на трэнера. І мы амаль усёй сваёй брыгадай зрабілі гэта.

Мая гульнявая кар'ера не надта задалася. У Савецкім Саюзе канкурэнцыя была вялізная, а ў нас у краіне тэніс толькі пачынаў развівацца. Для таго, каб выканаць нарматыў на майстра спорту, трэба было абгуляць трох гульцоў з сотні найлепшых або ўвайсці ў дзясятку найлепшых чэмпіянату Савецкага Саюза. Гэта было вельмі складана. Першым нарматыў майстра спорту ў Беларусі выканаў Генадзь Антонавіч Пятроў. Але яго так паважалі, што найлепшыя тэнісісты Савецкага Саюза, не пажаючы сваёй кваліфікацыі, маглі прайграць Пятрову. Верагодна, гэта былі яго сябры з Ленінграда.

Са сваімі вучнямі аб'ездзілі ўвесь Савецкі Саюз. Разам з Георгіем Краўковым рыхтавалі каманду на Спартакіяду школьнікаў, тады гэта былі вельмі буйныя спаборніцтвы. І наша каманда на Спартакіядзе ў Данецку заняла другое месца. За гэта мне прысвоілі званне заслужанага трэнера СССР. Спартакіяда школьнікаў была вельмі сур'ёзным турнірам. Пасля Спартакіяды народаў СССР гэта быў другі па значнасці турнір. Але за такі поспех маёй каманды мне далі грамату, прысвоілі заслужанага трэнера — і ўсё, ніякіх прызавых, нічога. Мы працавалі толькі за заробак. Але адзначу, што ў мяне заробак быў добры — 150 рублёў, у той час калі людзі атрымлівалі 70—80 рублёў. Але мы працавалі з 9 раніцы да 9 вечара. Адны сыходзілі, іншыя прыходзілі. Каб атрымліваць столькі, як я, трэба было весці 10 гурткоў, у кожнай групе па 20 чалавек. Вось і ўся матэматыка.

У 1965—1967 гадах тэніс пачаў развівацца ў абласцях. Пабудавалі тэнісныя корты ў Віцебску, Гомелі, Магілёве. Аркадзь Эйдэльман у арміі служыў у Гродне, пачаў там тэніс развіваць. І паступова тэніс з'явіўся ва ўсіх абласных гарадах. На чэмпіянат рэспублікі дапускалі па 16 хлопчыкаў і 16 дзяўчынак, і нават была канкурэнцыя, каму гуляць на чэмпіянаце БССР. Паступова тэнісных пляцовак рабілася больш і ў Мінску. Пабудавалі комплекс там, дзе зараз спартыўная школа «Змена». Спартыўныя таварыствы мелі свае пляцоўкі. «Буравеснік» — спартыўнае таварыства, і ў іх быў корт на тэрыторыі інстытута фізкультуры. Тэніс тады ўваходзіў у вучэбную праграму, была спецыялізацыя, вядома, студэнтам патрабавалася пляцоўка. З кожным годам у горадзе з'яўлялася ўсё больш кортаў. А наш Палац тэнісу стаў адным з найлепшых тэнісных комплексаў ва ўсім Савецкім Саюзе.

Тэнісам актыўна цікавілася вышэйшае кіраўніцтва Беларусі, яны ў яго гулялі. Таму ў нашага віду была добрая падтрымка і ў будаўніцтве залаў, і з правядзеннем спаборніцтваў. А калі ўжо з'явіліся нашы выдатныя тэнісісты, тады тэніс заняў сваё месца на найвышэйшым узроўні.

Мы вучыліся судзіць на сваіх памылках

Прафесійных судзейскіх брыгад раней не было. А як праводзіць матчы без суддзяў? Таму судзілі самі гульцы. Пераможца аднаго матча ішоў судзіць наступны. Які прайграў — засмучаны, хвалюецца. А пераможца задаволены, ён з рызыкай ідзе на вышку. Аднойчы і мяне запрасілі пасудзіць нейкі важны матч, цяпер ужо і не ўспомню, які. Мабыць, так добра зладзіўся, што мне прапанавалі актыўней заняцца судзействам. Так найлепшых суддзяў і адбіралі. У асноўным гэта былі дарослыя тэнісісты, якія нядрэнна разбіраліся ў гульні. Правілаў як такіх тады ж таксама не было, толькі лік. Цяпер ужо, вядома, шмат тонкасцяў, і суддзям складаней.

Я судзіў усе спаборніцтвы ў Савецкім Саюзе: чэмпіянаты, універсіяды, спартакіяды. Пасля фіналу зімовага чэмпіянату Савецкага Саюза 1963 года мне прысвоілі званне суддзі ўсесаюзнай катэгорыі. А мне на той момант было ўсяго 23 гады, такога ні ў адным відзе спорту не было. Звычайна такую катэгорыю атрымліваюць у 30—35 гадоў, а тут я ў 23. Гэта вельмі высокае званне. Суддзя Усесаюзнай катэгорыі судзіў на вышцы галоўныя спаборніцтвы СССР. На працягу 10 гадоў я ўваходзіў у тройку найлепшых тэнісных суддзяў Савецкага Саюза. Мы вучыліся судзіць на сваіх памылках. Правілы судзейства ў тэнісе распрацоўвалі метадам спроб і памылак.

Трэнер заўсёды на перадавой. Уладзімір ТУЖЫКАЎ падчас аднаго з тэнісных матчаў.

На працягу 43 гадоў я быў старшынёй рэспубліканскай калегіі суддзяў. У нашай краіне такога ні ў адным відзе спорту не было. Гэта вельмі вялікі аб'ём працы. Прызначыць суддзяў на матчы. Правесці з імі нарады, разабраць учарашнія памылкі, расставіць суддзяў. Праца вялізная. Пазней з'явілася Усесаюзная федэрацыя суддзяў, якая перад буйнымі турнірамі выдзяляла кожнай краіне пэўную колькасць месцаў для суддзяў. І мы падбіралі людзей. На буйныя турніры — вопытных, на спаборніцтвы, ніжэйшыя ўзроўнем, — тых, каму трэба было павучыцца. І пры гэтым справядліва, каб нікога не пакрыўдзіць. І выбраць найлепшых: суддзя ж таксама краіну прадстаўляе. Галоўным крытэрыем было судзейства на вышцы. Глядзелі, колькі разоў памыляецца, як паводзіць сябе падчас матча: гульцы ж розныя бываюць — могуць і пакрычаць. Я стараўся ўсім хлопцам даць дарогу. На буйныя спаборніцтвы адпраўляў дасведчаных. На спаборніцтвы прасцей — моладзь, прыцягвалі студэнтаў. Усе нашы гульцы вучыліся ў інстытуце фізкультуры: куды ж ім яшчэ ісці! Нават была спецыялізацыя па тэнісе. І каб атрымаць дыплом, трэба было мець судзейскую катэгорыю. Вось і яны імкнуліся матчы судзіць. Дзіцячыя спаборніцтвы толькі студэнты і судзілі. Да таго ж хлопцам за гэта давалі талоны на харчаванне, па рублі, па паўтара рубля. За ўсе дні. Ён пойдзе іх абмяняе — і вось у яго ўжо 10 рублёў. Для студэнта, маладога чалавека гэта нядрэнныя грошы.

Для суддзяў самае важнае — парадак і дысцыпліна. Гулец адразу адчувае, калі суддзя не ў форме. На суддзі, асабліва на важных матчах, вялізная адказнасць: на корце два моцныя гульцы, роўныя паміж сабой. І адна памылка суддзі можа моцна нашкодзіць камусьці з іх. Ёсць варыянт перайграць мяч, але да гэтага звяртаюцца вельмі рэдка. Вось і даводзіцца некалькі гадзін запар сядзець максімальна засяроджаным, нягледзячы ні на што.

Аднойчы я судзіў матч чэмпіянату Савецкага Саюза ў Ташкенце. Матч зацягнуўся на чатыры гадзіны — на залітым сонцам корце. А што рабіць — усе чатыры гадзіны з вышкі не сыходзіў. Суддзя на вышцы — вельмі важны чалавек на матчы, з ім пастаянна раіцца рэферы. Мусіць, таму суддзяў на вышцы рэдка караюць. Лінейнага суддзю можна лёгка замяніць, а суддзю на вышцы — толькі па рашэнні рэферы. А калі я на вышцы дапусціў сур'ёзную памылку, на наступны матч магу не трапіць. Усе лічаць сябе вялікімі суддзямі, вось і сочаць за сваімі паводзінамі. У асноўным падбіраюць суддзяў, якія не дапускаюць простых памылак. Калі суддзя на вышцы памыляецца, то сам гэта ведае і адчувае. Дасведчаны суддзя зразумее, што рабіць.

Як правіла, суддзяў караюць за парушэнні дысцыпліны. Памятаю, у Мінску праходзіў чэмпіянат Савецкага Саюза. Тады яшчэ быў суддзя, які «судзіў сетку», гэта значыць, сачыў, калі мяч зачапіў сетку пры падачы, а прыбораў жа не было. І вось масквіч судзіць сетку, а я з вышкі бачу, што ён паліць. Матч быў цяжкі, зацяжны. «Валодзя, хачу курыць не магу», — кажа мне. Відавочна, гэта бачыў толькі я, але ж і гледачы маглі заўважыць дым. Я як галоўны суддзя тады адразу ж яго адхіліў. Некаторыя суддзі могуць ужыць напоі мацнейшыя, што, вядома, недапушчальна. Але адзін вып'е сто грамаў, і па ім не будзе відаць. А другі моцна захопіцца — і тады даводзіцца караць. У такіх выпадках проста адхілялі ад судзейства. Аднойчы на матчы ў Данецку быў такі люты холад, што на вышцы немагчыма было сядзець. І нам налівалі па сто грамаў. Выключна ў медыцынскіх мэтах.

«Часы мяняюцца, а тэніс у Беларусі застаецца папулярны»

Некаторы час я займаў пасаду дзяржаўнага трэнера па тэнісе — раней была такая пасада. Дзяржаўны трэнер займаецца арганізатарскай працай. Ён кіруе ўсімі трэнерамі, праводзіць спаборніцтвы, рыхтуе ўсе патрэбныя дакументы, збірае дакументы для выезду спартсменаў на міжнародныя старты. Звычайная кабінетная праца. Я быў на гэтай пасадзе, у 1990-я. Гэта быў час развалу Савецкага Саюза. Столькі праблем з афармленнем дакументаў... каб спартсмены маглі выехаць за мяжу, трэба было абысці некалькі міністэрстваў, абараніць у чэргах у пасольствы. Вельмі шмат вымотвання нерваў. Мне камфортней на корце.

Колькі б гадоў я ні правёў у тэнісе, кожны раз, калі гляджу матчы, атрымліваю задавальненне. Сачу за ўсімі турнірамі, калі не атрымліваецца паглядзець трансляцыю, гляджу статыстыку. Бачу, як працуе спартсмен, наколькі ён рухомы, адразу вызначаю ступень стомленасці. Сёння тэнісісты добра падрыхтаваны фізічна. Раней жа — нейкія аднабокія. Андрэй Патанін, чэмпіён СССР, не ўмеў забіваць злева. Максім Мірны ўвогуле не мог гуляць ззаду. А зараз гуляюць і справа, і злева. І, вядома, у сучасных тэнісістаў зусім іншая матывацыя і магчымасці. Усе ўмовы для працы ёсць, грошы плацяць вялікія. Памятаю, я калі грамату на спаборніцтвах выйграў, быў самым шчаслівым. Пад кашуляй нёс яе ў школу, каб усім паказаць. Што парабіць... Часы мяняюцца.

Ды радуе, што часы мяняюцца, а тэніс у Беларусі застаецца папулярным і з кожным годам толькі дадае. Беларускіх тэнісістаў Максіма Мірнага, Віку Азаранку, Арыну Сабаленку ведае ўвесь свет. У якіх яшчэ гульнявых відах у нашай краіне такое ёсць?!

Да 80 гадоў я трэніраваў аматараў. І ганарыся, што многім людзям прынёс карысць, навучыў іх гуляць у тэніс. Гэта выдатны від спорту, карысны для здароўя, ён прыносіць вялікае задавальненне. Мае дзеці, унукі таксама гуляюць у тэніс. Я іх усіх навучыў. Але ведаю, што такое прафесійны спорт, што такое тэніс. І не хачу, каб яны займаліся прафесійна, не хачу, каб пакутавалі ў вялікім спорце. Прафесійныя тэнісісты жывуць на корце, у дзяцінстве яны свету белага не бачаць — толькі трэніроўкі. Але спорт у жыцці кожнага мусіць быць. Таму мы з унучкай абавязкова гуляем у тэніс, але выключна ў сваё задавальненне.

Калі чалавек не будзе любіць тое, што робіць, — у яго нічога не атрымаецца. Як у шлюбе: спачатку ўлюбляешся, потым пачынаеш нешта рабіць для аб'екта кахання, аддаеш яму ўсё. Я люблю тэніс, таму я ўсё жыццё ў ім. Калі не буду яго любіць, то гэта ўжо буду не я. Мне падабаецца важдацца з машынамі, ёсць іншыя захапленні, але такога кахання, як да тэніса, у мяне больш няма ні да чаго. Я аддаў яму ўсё жыццё. Я нідзе больш не працаваў, нічым іншым не займаўся. Я ўсё жыццё быў з тэнісам. Кожны мы адзін ад аднаго падзенемся?!

Раман ГЕСЦЬ:

«Я ведаў, што ў мяне ўсё напарадзе»

Галоўны чэмпіён пра галоўную перамогу

Гісторыя беларускага баскетбаліста, гульца клуба «Мінск» (у мінулым вядомага як «Цмокі») падобная на гісторыі многіх іншых маладых спартсменаў. Аднак лёс распарадзіўся так, што галоўнае стаборніцтва ў Рамана Гесця прайшло не на баскетбольнай пляцоўцы, а ў бальніцы. Спойлер: ён перамог. Таму гэтая гісторыя вартая таго, каб пра яе ведалі. Каб парадавацца за маладога моцнага хлопца, каб знайсці для сябе матывацыю і каб яшчэ больш палюбіць жыццё.

Пачыналася ўсё банальна. Хлопчык са Светлагорска за кампанію з сябрам запісаўся ў секцыю баскетбола. Здольнасці юнага баскетбаліста адразу заўважылі мясцовыя трэнеры, а сталічныя запрасілі на прагляд у Рэспубліканскае вучылішча алімпійскага рэзерву. «Спаў і бачыў, каб мяне запрасілі ў РВАР, гэта была самая вялікая мара. І мара здзейснілася. Мой трэнер сказаў, што мала трапіць на вучобу ў вучылішча — трэба там затрымацца. І я стаў старацца з усяе сілы», — расказвае Раман. Старанні хлопца не прайшлі дарма — яго заўважылі як перспектыўнага гульца, спачатку запрасілі ў клуб «Цмокі-Мінск», пасля ўключылі ў юнацкія зборныя. Раман абараняў гонар краіны на пяці чэмпіянатах Еўропы ва ўзроставых катэгорыях U-16, U-18 і U-20. Летам 2021 года маладзёжная зборная заняла другое месца на Еўрапейскім кубку выкліку. У складзе роднай каманды «Цмокі-Мінск» Раман увайшоў у лік найлепшых гульцоў Расійскай студэнцкай лігі.

«Лепш за ўсё запомніўся першы чэмпіянат Еўропы U-16. Мне было 15 гадоў, і ўсе хлопцы былі старэйшыя за мяне. Памятаю хваляванне перад стартам чэмпіянату, засталося ў памяці адчуванне таго, што ты на ўсё здольны дзеля перамогі. Прызнаюся: тады я моцна хваляваўся. Нават палохала, што мы выступаем за зборную, за краіну. Гэта надавала адказнасці. Але чым старэйшым станавіўся, тым спакайней да гэтага ставіўся. Потым тое стала надаваць мне матывацыі», — дзеліцца ўспамінамі спартсмен. Як паказаў вопыт, матывацыя гэтага спартсмена, як і любоў да сваёй справы, — бязмежная.

«САМ САБЕ КАЗАЎ, ШТО ГЭТА НЕ МОЖА БЫЦЬ КАНЕЦ»

Пра сваю хваробу Раман расказвае як пра складаны баскетбольны матч, які трымаў у напружанні ўсіх. Прынамсі, так і было. А сам ён яшчэ не раз скажа, што залог перамогі — пазітыўны настрой.

«Усё пачалося вельмі проста. Я вырашыў перавесціся з Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта фізкультуры ў Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт. Для пераводу трэба было прайсці медыцынскую камісію. Здаў аналіз крыві — дактарам не спадабаліся нізкія паказчыкі трамбацытаў, мала лейкацытаў. Пераздаў — ізноў тое ж самае. Першая думка: «Ну як такое магло са мной здарыцца!» Канешне, я ведаў, што ў маім узросце людзі могуць хварэць. Ну хто ж думае, што страшны дыягназ можа напаткаць менавіта цябе. Зразумела, у свой 21 год я ні аб чым такім не думаў. А тут...

Самае цяжкае было — сказаць бацькам. Калі першыя два разы здаваў аналізы — не казаў, думаў, абыдзецца, думаў, што ў лабараторыі памыліліся і ўсё наладзіцца, — навошта маму лішні раз турбаваць. Тым больш я ў 13 гадоў з'ехаў ад бацькоў і ўжо прывык свае праблемы вырашаць самастойна. Але калі стала зразумела, што ўсё сур'ёзна, то расказаў, што ў мяне дрэнныя аналізы і трэба класціся ў бальніцу.

Калі даведваешся пра сябе такую навіну, спачатку становіцца балюча. Галоўнае — надоўга не заставацца ў такім стане. Потым пачынаеш думаць, як вырашыць гэтую праблему, знайсці выхад, настройваешся на тое, што жыццё пойдзе інакш. Канешне, цяпер я магу казаць, што мне не было страшна, што я мужна ўсё прыняў. Аднак, шчыра, я тады ўнутры ведаў, што ўсё будзе добра. Я сам сабе казаў, што гэта не канец, што вельмі рана. Я ведаў, што ў мяне ўсё напарадзе. Стараўся нават жартаваць са сваёй хваробы. Праўда, сам смяяўся, а ўнутры было сумна.

Мяне лячылі дактары Рэспубліканскага цэнтра гематалогіі і перасадкі касцявога мозгу. Ведаеце, дактары — гэта героі, святыя людзі. Тое, што яны робяць, — подзвіг. Такая тытанічная праца павінна быць ацэнена на належным узроўні. У мяне было два варыянты: апластычная анемія (калі перастае працаваць касцяны мозг) і лейкемія (рак крыві). Вельмі страшныя хваробы.

Пацвярдзілася апластычная анемія. Дыягназ мне паставілі ў студзені. Паляжаў у бальніцы, адпусцілі дадому. А сакавік-красавік я правёў у бальніцы, праводзілі хіміятэрапію. Мы вельмі спадзяваліся, што «хімія» дапаможа. Калі б яна не дапамагла, трэба было б рабіць трансплантацыю коснага мозгу. Вельмі складана знайсці донара. Праверылі майго малодшага брата на супадзенне. Ён не падышоў. Мы з Ярославам аказаліся несумяшчальныя. Таму вельмі добра, што хіміятэрапія дапамагла. А вось калі яе робяць — адчуванні зусім нядобрыя, вельмі дрэнна сябе адчуваеш. Першы дзень самы складаны. Нават не ведаю, з чым параўнаць. А я яшчэ ўвесь гэты час ляжаў адзін у стэрыльнай палаце, каб не падхапіць ніякай інфекцыі. Былі нізкія лейкацыты, якія, па сутнасці, — супрацьпаветраная абарона арганізма, і трэба было берагчы імунітэт. Зразумела, што ніякіх наведвальнікаў у меня не было, акрамя дактараў і медыцынскіх сясцёр. Ратавалі фільмы, серыялы, кнігі. Спачатку цяжка, але праз 5—7 дзён прывыкаеш. Калі ты выконваў па дзве трэніроўкі на дзень, і яны рэзка спыняюцца, а ў графіку толькі сон і адпачынак — вось што складана.

«РОМА, МЫ З ТАБОЙ»

Раману ўвесь час была неабходна донарская кроў. А паколькі ён, на жаль, быў не адзіны такі пацыент, патрэбнасць у донарскай крыві была вельмі вялікая. Беларуская федэрацыя баскетбола запусціла дабрачынную акцыю «Рома, мы з табой». Свой каштоўны ўклад у выратаванне таварыша зрабілі баскетбалісты, супрацоўнікі Беларускай федэрацыі баскетбола, аматары, прадстаўнікі розных відаў спорту і мноства неабыякавых людзей.

«Роме дапамагаюць усе: нацыянальныя каманды, усе клубы, спартсмены прыязджаюць з розных гарадоў. Усе здаюць кроў. Калі мы даведаліся гэтую страшную навіну, калі з-за ўспышкі каранавіруса ўзніклі складанасці з донарскай крывёй, згуртавалася ўся баскетбольная грамадскасць. Мы — адзіная баскетбольная сям'я. На жаль, нашы спартсмены сутыкаюцца з праблемамі са здароўем. Але яны ведаюць, што кожны член баскетбольнай сям'і гатовы падставіць плячо. А Рома — наш галоўны чэмпіён», — дзялілася генеральны сакратар Беларускай федэрацыі баскетбола Настасся Марыніна.

Для Ромы здавалі кроў усе. Але не ўся гэтая кроў хлопцу дапамагала. Прычына простая — рэзус-фактар. Тая кроў, якая па гэтым паказчыку спартсмену не падыходзіла, ратавала жыццё іншым пацыентам. Такім чынам, дабрачынная акцыя «Рома, мы з табой» дапамагла многім іншым людзям. І што можа быць каштоўней за гэта? Сам галоўны чэмпіён прытрымліваецца такога ж меркавання:

«Я вельмі ўдзячны за гэту акцыю, за дапамогу. Я не прывык быць у цэнтры ўвагі, і таму мне было дзіўна, што столькі людзей зацікавілася маёй гісторыяй. Вялікі дзякуй Беларускай федэрацыі баскетбола, усім камандам, гандбольнаму клубу «СКА-Мінск», БДУФК, кожнаму, хто здаў кроў. Усе гатовыя былі дапамагчы фінансава, маральна, здаць кроў — усім, чым можна. Гэта дарагога варта. Але самае галоўнае — маральная падтрымка.

Мой сябар Цімафей Паралёў зараз таксама змагаецца са складанай хваробай, ужо праходзіць шостую хіміятэрапію. У студзені захварэў я, і праз два месяцы страшны дыягназ паставілі і яму. Мне вельмі хочацца, каб яго падтрымалі таксама, як і мяне. Гэта вельмі важна. Дзякуючы гэтай гісторыі я яшчэ раз упэўніўся, што баскетбол — гэта не проста так, калі людзі сабраліся разам. А што яны — насамрэч сям'я.

Я бачыў у бальніцы людзей з рознымі захворваннямі крыві, бачыў, як ім патрэбна донарская кроў. Яна патрэбна заўсёды. І я рады, што, ідучы дапамагаць мне, дапамаглі і іншым. Я кайфаваў, калі мне пераліваліі кроў. У мяне ж паказчыкі былі паніжаныя, з пераліваннем крыві паступалі новыя сілы, я адразу адчуваў сябе больш бадзёра, з'яўлялася энергія. Гэта — як тэлефон на зарадку паставіць».

«КОЖНЫ МАТЧ ДЛЯ МЯНЕ — ЭКЗАМЕН»

Нягледзячы на перамогу, лячэнне Рамана працягваецца, хлопец прымае лекавыя прэпараты, знаходзіцца пад назіраннем дактароў. Але, што самае галоўнае, ён вярнуўся ў баскетбол. Праўда, не як гулец, а як памочнік трэнера. Аднак хіба гэта важна?

«Галоўны трэнер клуба «Мінск» Расціслаў Мікалаевіч Вяргун летам пазваніў і прапанаваў мне паспрабаваць сябе ў ролі памочніка трэнера. Ну як я мог адмовіцца? Так мяне ўзялі ў першую каманду набірацца вопыту. Расціслаў Мікалаевіч сказаў, што бачыць у мяне патэнцыял трэнера і параіў праверыць свае сілы. Спачатку было нязвыкла, нават крыху страшнавата. Мне 21 год, а хлопцам, якіх я трэнірую, — па 35-36 гадоў. Гэта яны павінны мяне вучыць. Але сустрэлі мяне вельмі цёпла. Праўда, калі даведаліся, што я вяртаюся, былі ў шоку. У студзені паставілі дыягназ, а ў жніўні я ўжо быў на пляцоўцы. Безумоўна, з'яўляліся і жарты пра маё трэнерства, без гэтага ж у калектыве немагчыма.

Мне нязвыкла быць трэнерам, але падабаецца. Тое, што я застаўся ў баскетболе, — ужо шчасце. Свае трэнерскія здольнасці буду адпрацоўваць і на малодшым браце — Яраслаў узяў прыклад з мяне і таксама пайшоў у баскетбол. Будзем спадзявацца, што з яго вырасце добры баскетбаліст. Ён, як і я, жыве гэтай гульнёй, зараз вучыцца ў вучылішчы алімпійскага рэзерву. Думаю, вырасце недзе да 195 см і будзе разыгрываючым. Галоўнае, каб быў добрым чалавекам. Улетку з ім папрацуем Я і раней яму нешта падказваў, але зараз ужо больш шчыльна станем узаемадзейнічаць: у мяне ж ужо вопыт трэнерскі.

За гэтыя тры месяцы сваёй працы я зразумеў, як хвалюецца трэнер перад матчамі. Зараз мы выступаем у лізе ВТБ, і я вельмі перажываю за хлопцаў. Няхай я просты памочнік трэнера, у мяне ёсць свая зона адказнасці. Я працую і з гульцамі, якія аднаўляюцца пасля траўмы, праводзім агульныя фізічныя практыкаванні, аднаўляем тэхніку. І кожны матч каманды для мяне як экзамен.

Магчыма, у будучыні мне хацелася б адкрыць сваю баскетбольную школу. Але для гэтага трэба, каб сышлося ўсе зоркі. Неабходна набрацца трэнерскага вопыту, са здароўем усё павінна быць добра. Баскетбол пастаянна мяняецца, і патрэбна без перапынку за ім сачыць. Хоць гэта зусім не праблема.

Трэнерства — гэта, безумоўна, вельмі цікава. Але мяне цягне на пляцоўку як гульца. Не ўсё я тут выканаў. Праўда, не ведаю, наколькі магчыма вярнуцца. Дактары кажуць, што гэта — руская рулетка. Невядома, як арганізм сябе павядзе падчас фізічных нагрузак. Можа быць поўная рэмісія, і тады я змагу гуляць. А можа, пад нагрузкамі ўсё вернецца і касцявы мозг зноў перастане працаваць. Я вельмі хачу вярнуцца, але здароўе важнейшае. Таму пажывём — пабачым. Раз на два-тры тыдні я здаю аналізы, п'ю кожны дзень таблеткі. Адчуваю сябе здаровым, як да хваробы. Не магу сядзець без справы, мяне проста прэ нешта рабіць, кудысьці рухацца. Асабліва калі ўсё жыццё займаешся спортам, дык ужо без яго нікуды».

«АБ ЧЫМ ЯШЧЭ МОЖНА МАРЫЦЬ»

Пасля хваробы я зразумеў, што раней не цаніў самыя простыя рэчы. Я займаўся любімай справай са сваімі сябрамі — што яшчэ для шчасця патрэбна. Нават зараз я называю гэта работай, але, па сутнасці, я проста гуляю ў любімую гульню разам са сваімі сябрамі, вучуся ў людзей, ад якіх хацеў бы пераняць вопыт. Мне вельмі цікава працаваць з Расіславам Мікалаевічам Вергуном, Аляксеем Сухавецкім. Таму ў маі я проста не мог не прыйсці не падтрымаць нашу каманду на фінале чэмпіянату Беларусі. Усе былі ўзрушаны, не чакалі мяне бачыць. Настасся Уладзіміраўна Марыніна нават абуралася, чаму я прыйшоў, маўляў, не трэба было ісці туды, дзе шмат людзей, «абліла» мяне антысептыкам. Я, вядома, рызыкаваў, але інакш не мог. Дарэчы, вельмі ўдзячны Настассі Уладзіміраўне, яна мяне вельмі моцна падтрымлівала.

Яшчэ вельмі важны ўрок, які я вынес, — заўсёды сачыць за сваім здароўем і самаадчуваннем. Як у мяне ўсё пачыналася? Санлівасць, стомленасць. А ў мяне па дзве трэніроўкі на дзень — які яшчэ стан можа быць пасля іх?! Канешне, я не звяртаў на гэта ўвагі, спісваў усё на трэніровачны рэжым. Але да свайго арганізма варта прыслухоўвацца, даваць яму адпачынак. Стараюся данесці гэта і да блізкіх — яны ўжо прыслухоўваюцца.

Зараз у мяне ўсё добра. Я вучуся, атрымліваю вышэйшую адукацыю, ёсць дзе жыць, займаюся любімай справай. Родныя і блізкія здаровыя. Сябры побач. Мае самыя лепшыя сябры — Арцём Секушэнка, Ян Марынін, Аляксей Навойчык — гуляюць у Мінску, мы пастаянна разам. Аб чым яшчэ можна марыць?

Галоўнае, нават у самых складаных сітуацыях, — маральны пазітыўны настрой. Я гэта пераняў ад таты. Ён заўсёды кажа, што калі сядзець і перажываць, то можна звар'яцець. Заўсёды трэба старацца думаць пазітыўна. Праблемы гэтага баяцца.

Матэрыялы выпуску падрыхтавала Валерыя СЦЯЦКО.

Камфорт і імідж

Магілёў далучыўся да лічбавай экасістэмы «Наш горад»

Пагадненне падпісалі мэр Магілёва Аляксандр СТУДНЕЎ і генеральны дырэктар «Белтэлекама» Юрый ПЕТРУЧЭНЯ. Магілёў стаў першым абласным цэнтрам і другім горадам у Магілёўскай вобласці пасля Бабруйска, які задзейнічаны ў гэтай платформе. Праект «Наш горад» ужо рэалізаваны ў 12 гарадах Беларусі і яшчэ ў 12 знаходзіцца ў стадыі рэалізацыі.

— Праект уяўляе цікавасць у першую чаргу для насельніцтва, — заўважыў кіраўнік «Белтэлекама». — Прыемна, што Магілёў далучыўся да яго, не сумняваюся, што жыхары хутка адчуюць усю карысць ад праграмы. У ёй знаходзяцца ўсе прадпрыемствы, уся інфраструктура — гэта істотна аблягчае жыццё.

Пры падпісанні пагаднення былі адзначаны асноўныя кірункі далейшага супрацоўніцтва. «Белтэлекам» распрацаваў новы від кампетэнцый і збіраецца будаваць у краіне сетку электразаправак, у тым ліку ў Магілёве. Прынята рашэнне аб выдзяленні трох пляцовак для будаўніцтва электразаправак.

— Далучэнне да лічбавай экасістэмы сёння не раскоша, а неабходнасць, — падкрэсліў Аляксандр Студнеў. — Наш крок з «Белтэлекамам» — пашырэнне магчымасцяў і стасункаў як для саміх гараджан, так і для гасцей горада. Пры дапамозе гэтай праграмы можна лёгка арыентавацца ў гарадскім асяроддзі — усё будзе сканцэнтравана ў адным месцы. Гасцініца, цырульня, усякая іншая сацыяльная ўстанова. Платформа дае таксама магчымасць зайсці ва ўсе праблемныя месцы і папярэдзіць пытанні гараджан, пачынаючы ад гульнявых пляцовак і заканчваючы вывазам бытавога смецця. Яна дазваляе паспяхова кіраваць вулічнай гаспадаркай, у прыватнасці асвятленнем, кантраляваць камунальную галіну. Сфера дастаткова шырокая, важна сёння яе напоўніць. Думаю, кожнаму будзе цікава трапіць у гэтую сістэму, бо яна як той тэлефон, па якім мы чытаем навіны, адсочваем, што адбываецца ў свеце. Сёння важна паспець заявіць пра сябе. І чым больш гарадоў будзе задзейнічана ў гэтай платформе, тым прасцей даведацца, што адбываецца не толькі ў родным горадзе, але і ў іншых. Гэта камфорт і будучыня.

Мэр горада паабяцаў, што на працягу лістапада будуць вырашаны ўсе арганізацыйныя моманты з запускам праграмы.

— Перакананы, што ў найбліжэйшы час з'явіцца шмат зацікаўленых падключыцца да экасістэмы, — адзначыў Аляксандр Студнеў. — На сёння гэта 500 юрыдычных асоб. Праграма дазволіць нашым арганізацыям і прадпрыемствам гучна заявіць пра сябе. І яны ўжо гатовы напоўніць яе актуальнай інфармацыяй.

Распрацоўшчыкі абяцаюць, што інтэлектуальны прадукт зробіць наша жыццё на парадак больш камфортным і мабільным. З дапамогай яго будзе нескладана ў чужым горадзе забраніраваць месца ў гасцініцы, заказаць вячэру ў рэстаране і гэтак далей. Для канкрэтнага прадпрыемства або населенага пункта гэта магчымасць прабрэндзіраваць свае тавары і паслугі, паведаміць пра навінкі.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

Спажывец

НАЎЗДАГОН ЛЕТУ

Пакуль не выпаў снег, яшчэ не позна пакатацца на веласіпедзе або электрасамакаце

Зіма пакуль не спяшаецца заявіць свае правы, і гэта выдатна: можна паспець «даатрымаць» летнія (ну, або амаль летнія) уражанні. Напрыклад, у вольны час пакатацца на веласіпедзе.

Зразумела, што загарадныя маршруты, дзе няма асфальту, цяпер практычна недаступныя — грунтавыя дарогі размоклі ад дажджоў. Але там, дзе ёсць добраўпарадкаваныя велатрасы, яшчэ катаюцца веласіпедысты. «Электрасамакаткычыкаў» па вечарах на вуліцах яшчэ дастаткова, а большасць велапракатаў пакуль сезон не закрылі. Так што калі халодны туман або дробны дождж вас не палохае — можна пракаціцца з ветрыкам яшчэ ў гэтым годзе. Дададзім, што ў апошнія гады Мінск і абласныя цэнтры сталі выглядаць досыць прыязна для амататараў «зялёнага транспарту»: ёсць і веладарожкі, і трасы ў парках і скверах, і нават дзе-нідзе — спецыяльныя пераезды праезнай часткі для двухколавага транспарту. А таксама магчымасць арандаваць веласіпед або электрасамакат наўпрост на вуліцы, не заходзячы ў «пункт пракату», і пасля завяршэння паездкі пакінуць транспарт там, дзе зручна. Так што неабавязкова быць уладальнікам двухколавага «каня», можна проста ўзяць яго напракат на пэўны час — гэта, дарэчы, вызваляе ад вырашэння такіх пытанняў, як захоўванне транспарту і яго тэхнічнае абслугоўванне. Хоць зімовае захоўванне асабістага двухколавага транспартнага сродку цяпер увогуле не праблема: такую паслугу актыўна прапануюць сэрвісы па пракаце і рамонце веласіпедаў, і каштуе яна ў сярэднім каля 30—50 рублёў за тры месяцы за веласіпед (можна знайсці варыянт 50 рублёў за паўгода, 70 — разам з тэхабслугоўваннем «жалезнага каня») і каля 100 рублёў за электрасамакат (125 — з ТА). Па веласіпедах прапануецца таксама варыянт 15 рублёў у месяц — калі надвор'е дазволіць завяршыць сезон пазней або вы захочаце забраць велік крыху раней.

БАЙКШЭРЫНГ

Піянерам бесстанцыйнага сэрвісу пракату веласіпедаў, электравеласіпедаў і электрасамакатаў некалькі гадоў таму стаў у Беларусі сэрвіс Kolabike (ярка-жоўтыя веласіпеды і самакаты — ужо звыклая частка гарадскога пейзажу, прычым не толькі мінскага). Амаль адначасова з ім або крыху пазней з'явіліся іншыя — напрыклад, аранжавыя Velosmart, або сінія JET, або папулярны ў мінчан шэрынг электрасамакатаў Eleven. Ёсць такія сэрвісы і ў абласных цэнтрах. Сістэма арэнды простая: трэба спампаваць дадатак сэрвісу на свой тэлефон — ён пакажа, дзе знаходзяцца незанятыя «транспартныя сродкі». Знаходзіце той, што паблізу, аплачваеце паездку, прывязаўшы банкаўскую картку да дадатку — і наперад. Каб разблакіраваць абраны сродак, трэба ўвесці яго ID. Калі карыстаецеся шэрынгам упершыню, і асабліва калі не належыце да пакалення «лічбавай моладзі», магчыма, спачатку прыйдзецца трохі напружыцца, каб зразумець, якія менавіта лічбы маюцца на ўвазе (падказка: не тыя, што буйна напісаны на раме). І далей пачынаецца адлік часу паездкі. Невялікая сума здымаецца за разблакіроўку, і потым тарыфікацыя ідзе кожныя паўгадзіны — але, калі вы не фанат веласпорту, наўрад ці здолееце пракатаць нашмат больш за дзясятку. Пасля завяршэння веларагулкі важна «закрыць» рычаг электроннага замка і пераканацца, што дадатак перастаў лічыць час вашай паездкі. Калі нешта пайшло не так (час паездкі лічыць дадатак не перастаў, узніклі праблемы з аплатай і г. д.), варта адправіць паведамленне пра памылку.

Трэба сказаць, што веласіпеды, якія прапануе байкшэрынг, надзейныя і ад гэтага дастаткова цяжкія — па адчуваннях парадку кілаграмаў 15. Нізкая рама зручная для дзяўчат. Напрыклад, калі вы не ў спартыўнай вопратцы, а, скажам, у спадніцы (дапусцім, спазняецеся і вам тэрмінова трэба кудысьці дабрацца, абыходзячы «пробкі»). На гэты выпадак веласіпед забяспечаны і кошыкам наперадзе: для сумкі. Зрэшты, зараз, глыбокай восенню, шэрынгавых веласіпедаў на вуліцах зусім мала, больш электрасамакатаў. Сістэма іх арэнды тая ж, кошт у розных сэрвісаў адрозніваецца, але ў цэлым — у межах 6—10 рублёў за ўмоўныя 10 кіламетраў. Дарэчы, падчас паездкі на электрасамакаце важна памятаць, што, згодна з новымі правіламі дарожнага руху, забараняецца перасоўвацца на сродках персанальнай мабільнасці з хуткасцю больш за 25 км/г.

Электравеласіпеды — яшчэ адзін від гарадскога транспарту, які можна ўзяць на пракат «аддалена». Невялікі электраматор дапамагае веласіпедысту рухацца хутчэй (веласіпед мае тры рэжымы магутнасці) і эканоміць сілы.

— Успамінаецца, як бацька вучыў катацца на двухколавым «дарослым» веласіпеды ў дзяцінстве — нібы нехта акуратна надае веласіпедзе паскарэнне, падштурхоўваючы ззаду, — распавяла знаёмая, паспрабаваўшы гэты «транспарт» упершыню.

Сістэма «аддаленай» арэнды транспартнага сродку, безумоўна, зручная, і гэта сусветная практыка. Хоць многім — асабліва людзям больш сталым — усё ж бліжэй магчымасць непасрэдных зносін з супрацоўнікам сэрвісу. Паколькі аддаленае падпісанне дагавора пракату (то-бок проста птушачка ў квадраціку) пры няўважлівым стаўленні (а ці многія на вуліцы стануць чытаць дагавор на экране тэлефона? Пагадзіцеся, мала хто) можа прывесці да штрафу. Напрыклад, дасведчаныя карыстальнікі шэрынгу рэкамендуюць перад паездкай сфатаграфаваць абранага «жалезнага каня» з усіх бакоў. Таму што гэта можа зрабіць наступны за вамі яздок, і калі сродак будзе мець пашкоджанні, цалкам магчыма, вінаватым у пасаванні маёмасці палічаць карыстальніка папярэдняга, а гэта якраз вы. Таксама важна (і гэта ўказана ў дагаворы), што пакідаць сродак пасля паездкі можна ўсюды — але не ўсюды наогул. Напрыклад, у пад'ездзе — нельга. За гэта прадугледжаны штраф. Таксама нельга кідаць байк або самакат пад мостам, у падземным пераходзе — там, дзе не «ловіць» GPS. Ёсць і яшчэ некалькі нюансаў. Штрафы немаленькія, так што, калі карыстаецеся байкшэрынгам упершыню — усё ж прачытайце дагавор, перш чым ставіць птушачку, што «азнаёмленыя і згодныя».

І ПРОСТА ПРАКАТ

А наогул, для велапрагулак выхаднога дня многія лічаць падыходнымі больш «спартыўныя» мадэлі — так званыя «гібрыды», «фітнес-мадэлі» або непасрэдна спартыўныя веласіпеды. Па пасадцы веласіпеды, якія прапануюць сэрвісы байкшэрынгу (так званыя «гарадскія» або «прагулачныя») — з прамой спінай і высокім рулём. Шмат каму падаецца больш зручным і звыклым сядзець вышэй, з нахілам цела наперад. Ды і колы многім падабаюцца пабольш. За такім «велікам» у пракат прыйдзецца мэтанакіравана ісці (хоць многія пракаты прапануюць і дастаўку). Цэны адрозніваюцца, але ў сярэднім абыдзецца пракат 5-6 рублёў за гадзіну і 9 рублёў за 2 гадзіны. Суткі пракату будуць каштаваць парадку 20 рублёў, двое сутак — 25—30 рублёў, і яшчэ 5 рублёў — за кожны дзень «зверху». У сувязі з восеньскім падзеннем попыту можна адшукаць спецыяльныя прапановы — ад 2 рублёў гадзіна і ад 8 рублёў у суткі на пэўныя мадэлі.

— Хто бярэ цяпер веласіпеды напракат? Ды многія, — распавядае супрацоўнік сэрвісу пракату Сяргей. — Вось, напрыклад, мамы з дзецьмі бяруць: і летам, і восенню. Падлетку веласіпед купілі, а сабе мама вырашыла не купляць, бо якасная мадэль каштуе дорага, плюс яе трэба дзесьці захоўваць, да таго ж час ад часу патрэбен рамонт і абслугоўванне. Таму катаюцца на адным з дачкой або сынам — у розны час. А калі вырашылі пакатацца разам, бяруць другі напракат. Часта бяруць два напракат, для мамы і таты, калі запланавалі «сямейны выезд». Пенсіянеры — таксама нашы кліенты. Сучаснае пакаленне бабуль і дзядуляў — у асноўным бабуль, вядома — актыўнае (іх нават бабулямі неяк язык не паварочваецца называць). Наогул, жанчын сярод нашых кліентаў значна больш, чым мужчын. Але ў пракатах каля велатрас па-іншаму: там шмат моладзі, і часцей веласіпеды бяруць напракат хлопцы. Для многіх, хто сур'ёзна «сябруе» са спортам (займаецца бодзібілдынгам або адзінаборствамі), веласіпед — дадатковы від трэніроўкі.

А ў маленькіх сэрвісах, як правіла, распавёў суразмоўца, веласіпед бяруць на гадзіну або на дзве.

— Наш пракат знаходзіцца ў «спальным» раёне, і зразумела, што нашы пастаянныя кліенты — не спартсмены, а проста звычайныя людзі, якія час ад часу хочуць актыўнага адпачынку і псіхалагічнай разрадкі. Для гэтай мэты лепш за велапрагулку не прыдумаеш, асабліва ўвосень, калі актыўнасць паступова зніжаецца.

У сэрвіс прыйдзецца захапіць з сабой пашпарт для заключэння дагавора пракату, і, магчыма, вас папросяць пакінуць што-небудзь у заклад. Як правіла, вялікія пракаты размешчаны паблізу ад велатрас (у Мінску — каля Мінск-Арэны, у парках — Горкага, Лошыцкім; на набярэжнай Свіслачы, на Камсамольскім возеры і г. д.). Але досыць іх і ў дамах быту, рамонтных майстэрнях і на першых паверхах крам у так званых спальных раёнах. Ці танней там, чым у вялікіх пракатах? Наўрад. І выбар значна меншы. Затое ў такіх маленькіх сэрвісах пракату можна завесці «свайго» любімага «сябра» — пратэсціраваўшы ўсе, выбраць самы зручны менавіта для вас. А калі вы пастаянны кліент і, дапусцім, забыліся пашпарт, вам, цалкам магчыма, паверацца на слова. Бо чалавечыя адносіны ніхто не адмяняў.

Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.

Аляксандр РАДЗЬКОЎ

Слова пісьменніка

РЭКТАРЫ: урыўкі з кнігі

Міхаіл Васільевіч стаў ужо і прыкметнай палітычнай фігурай, у 2000 годзе быў абраны ў Савет Рэспублікі. Але ў тыя гады ў гомельскіх ВНУ праявілася карупцыйная зараза. Спачатку яна спрычынілася да рэктара медыцынскага інстытута, а пасля «зачапіла» цэлую групу кіраўнікоў і выкладчыкаў Гомельскага ўніверсітэта. За хабар на ўступных экзаменах яны былі пакараны і асуджаны на немалыя турэмныя тэрміны. Непрыемная для ўсіх выкладчыкаў ВНУ гісторыя, я асабіста бачыў, як цяжка яе перажываў рэктар Селькін. У гэтай сітуацыі ён прыняў рашэнне сысці ў адстаўку.

Пасаду рэктара Гомельскага ўніверсітэта я вырашыў прапанаваць дырэктару Інстытута механікі металапалімерных сістэм імя У. А. Белага, намесніку старшыні Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук, члену-карэспандэнту, доктару тэхнічных навук, прафесару Юрыю Міхайлавічу Плескачэўскаму, які раней доўга працаваў у Гомелі. Але ці адпусціць яго старшыня Прэзідыума М. У. Мясніковіч? Мне патрэбен быў момант для перагавораў з Міхаілам Уладзіміравічам Мясніковічам з гэтай нагоды. І я яго знайшоў. Мы прыйшлі на нараду да Прэзідэнта, дзе Мясніковіч дакладваўся, а я толькі прысутнічаў. Перад пачаткам я максімальна наблізіўся да Міхаіла Уладзіміравіча:

— Мне патрэбен Плескачэўскі. Мясніковіч глыбока ўздыхнуў і крыху ад мяне адхіліўся:

— Навошта?

— Рэктарам Гомельскага ўніверсітэта.

Мясніковіч выдыхнуў:

— Не супраць.

Я яшчэ раз пераканаўся ў мудрасці і вопытнасці Міхаіла Уладзіміравіча — у гэтай сітуацыі ён усё ж здолеў узяць на развагі секундную паўзу — у час выдыху.

Але гэта прызначэнне ў мяне не атрымалася. Калі я пайшоў з ім у Адміністрацыю Прэзідэнта да першага намесніка Аляксандра Андрэевіча Папкова, ён мне заявіў:

— Шукай на пасаду рэктара іншую кандыдатуру. Плескачэўскага мы плануем прызначыць старшынёю Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях.

Але гэта таксама было добрым рашэннем для рэктарскага корпуса. Камітэт размяркоўваў па навуковых установах заданні на даследаванні і адпаведнае фінансаванне. Асноўная барацьба за іх аб'ёмы заўсёды вялася паміж інстытутамі Акадэміі і ўніверсітэтамі Міністэрства адукацыі. Аднаму мне сапернічаць з Міхаілам Уладзіміравічам было цяжка, і падтрымка з боку старшыні камітэта па навуцы была як нельга дарэчы. У прафесары Плескачэўскім я не памыліўся — пасля прызначэння на гэтую пасаду пры рашэнні многіх пытанняў ён імкнуўся быць максімальна аб'ектыўным.

І губернатару А. С. Якабсону, і старшыні Савета рэктараў прафесару Шымаву, і мне бачылася, што ў сітуацыі, якая склалася вакол рэктара Гомельскага ўніверсітэта, трэба прызначыць падрыхтаванага да гэтай пасады чалавека з іншай ВНУ. Спынілі свой выбар на доктары хімічных навук, прафесары Аляксандры Уладзіміравічы Рагачове. Ён у гэты час працаваў прарэктарам па навуковай рабоце ў Беларускім універсітэце транспарту, пад кіраўніцтвам вопытнага рэктара прафесара Веніяміна Іванавіча Сянько, а ў свой час закончыў фізмат Гомельскага ўніверсітэта. Прэзідэнт пагадзіўся з нашай прапановай.

Аляксандр Уладзіміравіч таксама належаў да катэгорыі рэктараў прарырытэтна вучоных. Ён працягваў свае даследванні ў галіне фізічнай хіміі, яго выбралі членам-карэспандэнтам Нацыянальнай акадэміі навук. Але і над развіццём універсітэта ён працаваў творча і грунтоўна. Мне, напрыклад, спадабаліся яго падыходы да ўсталявання навуковых і адукацыйных сувязяў з кітайскімі калегамі. Ён нават планаваў за кошт кітайскіх інвестыцый пабудаваць насупраць універсітэта культурна-адукацыйны цэнтр з гасцініцай для студэнтаў. Прыгожы праект, на жаль, не атрымаўся. Але Аляксандр Уладзіміравіч чалавек ініцыятыўны, з ім заўсёды было цікава. Кіраваў ён універсітэтам дванаццаць гадоў. Цяпер там працуе рэктарам таксама выпускнік гэтага самага ўніверсітэта, доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар Сяргей Анатольевіч Хахомаў.

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт транспарту (БелДУТ), знакаміты БІІЧТ, быў створаны ў 1953 годзе для падрыхтоўкі інжынераў чыгуначнага транспарту для ўсяго Савецкага Саюза. Выпускнікі інстытута размяркоўваліся па аддзяленнях чыгункі ад Брэста да Уладзівастока. Абслугоўвалі і развівалі чыгуначныя магістралі, займаліся навуковай працай, вырасталі па службе. І рэктар БелДУТ, а ў мой час гэта доктар тэхнічных навук, прафесар Веніямін Іванавіч Сянько, мала таго, што ведаў усіх сваіх знакамітых выпускнікоў, — ён узважана задзейнічаў іх у развіцці ўніверсітэта. Шмат каго з іх я бачыў, калі быў запрошаны на святкаванне 50-годдзя ВНУ.

У гэты дзень на ўрачыстым сходзе з дакладам пра сучасны стан і шляхі развіцця ўніверсітэта выступіў рэктар, выпускнік БІІЧТ, прафесар Сянько. Пасля пра дасягненні эканомікі сучаснай Беларусі расказаў прэм'ер-міністр, доктар тэхнічных навук, выпускнік таго самага БІІЧТ, Сяргей Сяргеевіч Сідорскі, далей пра гаспадарчыя і адукацыйныя поспехі ў Гомельскай вобласці сходу далажыў губернатар, выпускнік ізноў таго самага БІІЧТ Аляксандр Серафімавіч Якабсон. І ўсе яны гаварылі пра ўніверсітэт, гады сваёй вучобы, любімых выкладчыкаў. Пасля слова далі міністру адукацыі, і я адчуў, што гаварыць у гэтай аўдыторыі магу ўжо свабодна:

— У 1904 годзе ў Расіі была ўведзена ў эксплуатацыю чыгунка Санкт-Пецярбург — Адэса. Яна, у прыватнасці, прайшла па беларускіх гарадах Віцебск, Орша, Магілёў, Жлобін, Гомель. Тым самым у гэтыя і іншыя гарады прыйшла цывілізацыя. Але чыгунка абышла бокам старадаўні беларускі Мсціслаў. Гэты горад са старажытнымі храмамі і манастырамі быў здаўна апірышчам праваслаўнай веры на нашай зямлі, але з пачаткам інтэнсіўнага руху тавараў і людзей па чыгунцы ён пачаў чахнуць. Вярнуць яго ранейшую веліч у той час магчыма было толькі двума спосабамі — наблізіць да яго чыгунку ці адкрыць там педагагічнае вучылішча. Рашэнне па гэтым пытанні прымаў асабіста расійскі цар Мікалай II. Чыгунку цягнуць да Мсціслава аказалася неймаверна дорага. Указам цара ў гэтым горадзе было адкрыта педагагічнае вучылішча. А вось Гомелю пашчасціла: у яго БІІЧТ два ў адным: і чыгунка, і навучальная ўстанова!

З рэктарамі БІІЧТ таксама пашчасціла з самага пачатку. Яго ўзначальвалі вядомыя вучоныя, буйныя кіраўнікі падраздзяленняў чыгункі, я іх усіх уяўляю па вобразе Сянько. Невысокі, каранасты, але заўсёды рухавы, энергічны, напоўнены ідэямі і нязломным жаданнем рэалізаваць іх без усялякага прамаруджвання. Прабіўны! У Мінск прыязджаў рэгулярна і па сваіх рэктарскіх справах перш за ўсё наведваў кіраўніцтва Беларускай чыгункі. Ён жа там працаваў, пастаўляў інжынерныя кадры, таму дамаўляўся пра фінансаванне перспектыўных навуковых даследаванняў, пастаўку лабараторнага абсталявання, аб прыёме студэнтаў на вытворчую практыку, аб месцы для працы яго выпускнікоў. Не ўсё і адразу вырашалася, але такія абходы рэктар рабіў рэгулярна. І аддача ад іх была прыкметная. Напрыклад, з дапамогай Беларускай чыгункі Веніямін Іванавіч абсталяваў ва ўніверсітэце выпрабавальны палігон для вагоннай гаспадаркі. Вучэбны, але абсталяваны так, што вагоны там выпрабоўвалі з усяе Беларускай чыгункі і нават з суседніх расійскіх рэгіёнаў. І Сянько на гэтым зарабляў для ўніверсітэта немалыя пазабюджэтныя грошы.

А перад тым, як зайсці да міністра адукацыі, Веніямін Іванавіч абавязкова наведваў выпускніка свайго ўніверсітэта прэм'ер-міністра С. С. Сідорскага. Але мяне да гэтага папярэджваў, што будзе ў яго для ўніверсітэта прасіць, каб я быў гатовы да магчымых даручэнняў. Так мы з рэктарам знайшлі сродкі для надбудовы двух паверхаў над яго старым вучэбным корпусам. Яны самі зрабілі разлікі дазволеных пры гэтым нагрузак на падмуркі і сцены.

Выкладчыкі і студэнты да свайго рэктара ставіліся з павагай. Папулярны і прыкметны ён быў і ў рэктарскім корпусе. За вочы многія ласкава называлі яго Веня. Гумар у яго быў прыродны, анекдоты яму былі не патрэбныя, з лішкам хапала каларытных расповедаў з жыцця.

Але карупцыйная ржа зачапіла і яго калектыў, не так глыбока, як суседнія ВНУ, але ўсё адно хваравіта. Рэктар не чакаў такіх праяў у сваёй роднай ВНУ, ад перажыванняў захварэў, паправіўся, працаваць імкнуўся ўсё гэтак жа актыўна, але наступствы хваробы сказваліся. У адстаўку сышоў у 2016 годзе. На яго месца прыйшоў доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар Юрый Іванавіч Кулажанка. Ён выпускнік Гомельскага ўніверсітэта імя Ф. Скарыны, але працаваў прарэктарам у БелДУТ і першым прарэктарам у сваім універсітэце. У Гомелі цікавы вопыт падрыхтоўкі рэктараў.

Пераклаў з рускай мовы Кастусь ЛАДУЦЬКА.

(Працяг будзе 19 лістапада.)

(Працяг. Пачатак у нумарах за 26 сакавіка; 2, 9, 16, 23, 30 красавіка; 7, 14, 28 мая; 11 чэрвеня; 9, 16, 23, 30 ліпеня; 13, 20, 27 жніўня; 3, 17, 24 верасня; 1, 8, 15, 29 кастрычніка, 5 лістапада.)

Навінкі кнігавыдання

Сведчаць «людзі... з агню, з-пад зямлі...»



Выйшла новае выданне легендарнай кнігі Алеся АДАМОВІЧА, Янкі БРЫЛЯ, Уладзіміра КАЛЕСНІКА «Я з вогненнай вёскі»

Пра гэтую кнігу вядома досыць шмат. Яе ўсё часцей згадваюць зараз, у Год гістарычнай памяці. Да яе старонак звяртаюцца журналісты, публіцысты, якія прадаўжаюць тэму, расказваюць пра тыя, блізкія ім паселішчы, якія былі спалены ў Вялікую Айчынную вайну нямецка-фашысцкімі карнікамі і іх зладзеямі-памагатымі розных нацыянальнасцяў. Але неяк так склалася, што апошняе выданне ў Мінску было здзейснена дваццаць гадоў таму (нагадаем: упершыню кніга пабачыла свет у 1975 годзе — на беларускай мове. Наступным было выданне на рускай мове — у 1977-м — у перакладзе нашага земляка, ураджэнца Веткаўшчыны, Гомельскай вобласці паэта Дзмітрыя КАВАЛЁВА). Зараз «Мастацкая літаратура» выпусціла кнігу накладам 1000 экзэмпляраў. Набыць «Я з вогненнай вёскі» можна ва ўсіх кнігарнях ААТ «Белкніга» — у розных гарадах краіны, а таксама ў кнігарні «Акадэмкніга» па адрасе: Мінск, праспект Скарыны, 72.

«На старонках гэтай кнігі сабраліся людзі, што выйшлі з агню, з-пад зямлі. І гэта — у самым рэальным, не пераносным сэнсе. Людзі з вогненных вёсак сабраліся тут, каб сведчыць, пытацца, судзіць, каб расказаць тое, пра што ведаць — страшна, а забыцца — небяспечна», — гэтымі словамі адкрываецца кніга-дакумент.

Збіраючы матэрыялы для зборніка жудаснай, трагічнай, драматычнай гістарычнай памяці на тэму «вогненных вёсак», пісьменнікі аб'ездзілі 147 вёсак у трыццаці пяці раёнах Беларусі. Зрабілі гэта надзвычай інтэнсіўна — на працягу 1970—1973 гадоў сустрэліся з сотнямі непасрэдных сведак знішчэння людзей і вёсак, сотнямі сведкаў, якія літаральна цудам ацалелі...

Прачытайце гэтыя балючыя старонкі, зазірніце ў лёсы нашых дзядоў і прадзедаў, нашых папярэднікаў, — можа быць, і на сучаснасць ваш позірк стане крыху інакшым, можа быць, нешта важнае вы здолееце перадаць сваім дзецям, унукам...

Сяргей ШЫЧКО.

Наш культурны асяродак
Жырандоля
Выпуск № 77 (603)

Галіна ГАРЭЛАВА:

«НАША МІСІЯ — ЗАХАВАЦЬ ТВОРЧЫ ПАТЭНЦЫЯЛ НАЦЫІ»

МУЗЫКА — мастацтва, здольнае з дапамогай усяго сямі нот адлюстраваць бясконцую палітру пачуццяў, сэнсаў і падзей, якія адгукаюцца ў душы творцы. Кампазітар, заслужаны дзеяч мастацтваў Галіна Гарэлава таксама належыць да шэрагу тых, хто ўмее здзяйсняць такія «пераклады», ствараючы інструментальныя канцэрты, санаты, сюіты, фантазіі, вакальныя цыклы, музыку для дзяцей і да спектакляў... Яна вучылася ў найлепшых — Анатоля Багатырова, Дзмітрыя Смольскага, Юрыя Фартунатава і вось ужо 42 гады вучыць студэнтаў у сценах Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі. Сёлета ўстанова адзначыць сваё 90-годдзе. Мы сустрэліся там з Галінай Канстанцінаўнай, каб распытаць пра творчасць, час і місію творчай асобы ў абодвух кантэкстах.

— Галіна Канстанцінаўна, у Беларускай дзяржаўнай філармоніі на адкрыцці сезона адбылася прэм'ера вашай сюіты «Душа над горадам», прысвечанай Марку Шагалу. Як доўга працавалі над ёю, і ці заўсёды твор даходзіць да гледача ў тым выглядзе, як задумвае яго аўтар?

— Мне блізкі стыль «містычнага рэалізму» Марка Шагала, хоць сама — абсалютны традыцыяналіст. Мяне зачароўваюць шагалаўскія героі (закаханыя, кароўка са скрыпкай, гадзіннікавы майстар), якія лётаюць над горадам. Ёсць у гэтых палётах пачуццё свабоды. І аднойчы да мяне прыйшла балерына Юлія Маркоўская і распавяла, што ёй хацелася б увасобіць вобразы Марка Шагала ў пластыцы на сцэне. Я адразу адмовілася, патлумачыўшы, што не з'яўляюся тэатральным кампазітарам. Плюс я разумела, наколькі гэта вялікі пласт працы, але Юля вельмі гарэла сваёй ідэяй. Яна мела ўжо план лібрэта, ставіла «Сон Бэлы» з танцоўшчыцай. Яе пастаноўку нават у план тэатра ўнеслі. Пасля на мяне выйшаў яе кіраўнік. Праца доўжылася два з паловай года. Аднак з часам з'явіліся сумневы, што давядзём да фіналу справу... У тэатры ўзнікалі перашкоды. І самой было цяжка. Калі пішаш партытуру ў 250 старонак (на кожнай 24 нотныя радкі!), то і спіны не адчуваеш, і вочы баляць... Але, абіраючы шлях кампазітара, трэба быць гатовым да таго, што не ўсё з напісанага будзе абавязкова рэалізавана. Я і сваім студэнтам кажу, што творчая праца не бывае дарэмнай. А вось у Юлі вочы патухлі, хоць мы верылі, што ўсё атрымаецца.

— Як жа твор трапіў у філармонію?

— Калі стала зразумела, што пастаноўка не адбудзецца, я папрасіла вярнуць з тэатра маю партытуру. А потым Аляксандр Міхайлавіч Анісімаў, рыхтуючы канцэрт, прапанаваў мне са зробленай музыкі скласці сюіту. З амаль што дзвюх гадзін музыкі мы адабралі дваццаць хвілін, пакінуўшы там нумары, якія спалучаюцца па кантрасце. Дарэчы, заканчваецца сюіта развітаннем з Віцебскам, які для героя так і застаўся назаўсёды ідэальным светам... Ідэальнае павінна заставацца ў жыцці заўсёды...

Дабрацца да аркестра шанцуе нямногім маім калегам. Доўгі час праходзіць ад моманту напісання партытуры і да яе рэалізацыі. Мне, лічу, пашчасціла атрымаць прапанову аб супрацоўніцтве ад маэстра Анісімава, і я яму за гэта вельмі ўдзячная. Безумоўна, можна пісаць у стол і суцяшаць сябе булгакаўскімі словамі «рукапісы не гараць», але калі мы гаворым пра музыку, то ў стале яна не жыве. На прэм'еры мне адна жанчына, якая сядзела побач, сказала, што не чакала «пачуць такую музыку ад беларускага кампазітара». Я пытаюся: «Не верыце ў беларускую музыку?» Кажа: «Цяпер веру!» Таму, каб у нашу беларускую музыку верылі, трэба каб яна гучала!

— Лічыцца, што музыка — мастацтва, якое не патрабуе перакладу. Ці ёсць у вас сваё ёй вызначэнне?

— Музыка заўсёды знаходзіцца па-над усімі межамі. Неяк на фестывалі Юрыя Башмета была прэм'ера твора Сафіі Губайдулінай, і напярэдадні ў нас адбылася сустрэча з ёй. Сафія Асгатаўна сказала, што нацыя — гэта арганізм, а акадэмічнае мастацтва — гэта дыханне нацыі! Але мала толькі пачуць яе словы — трэба зразумець сказанае.

— Вы неяк адзначалі, што з узростам пісаць становіцца складаней, бо павялічваецца патрабавальнасць да сябе. У чым яна выяўляецца?

— У маладосці, калі ты славалюбівы (творчым людзям гэта неабходна), то вызначаеш сабе планку і верыш, што дасягнеш яе. Толькі мы не ўлічваем, што планка будзе расці разам з намі. Таму з узростам усё часцей пачынаеш ладзіць сабе «страшны суд». Вось перад прэм'ерай чаго нервуешся? Таму што ўсё разлічыў і выбудаваў у сябе ў галаве, а пасля думаеш: ці будзе твор гучаць, а раптам музыканты не справяцца і г. д. Усе часы па-свойму складаныя, але, дзякаваць богу, мне ніхто не загадваў, што я павінна пісаць. Хоць калегі мае пісалі на замову і за тое атрымлівалі добрыя грошы. Я нікога не асуджаю, але шчаслівая, што ў мяне засталася творчасць — тая зона сумлення, дзе ты здольны застацца сабой.

— А што дало вам першы імпульс, каб выказацца на мове музыкі?

— Мой першы твор меў назву «Зязюля». Вобраз гэтай птушкі мяне ўвогуле суправаджае ўсё жыццё як нейкі сімвал часу, а можа, смерці. Памятаю, чытала Ахматаву, і мяне зачароўвалі яе радкі «...Когда моя настанет смерть, // Душа кукушкой обернётся, // В густой листве цветущих груш // Я полночью глухою спрячусь // И так во мраке запою, // Что милый голос мой узнает...». А дванаццаць гадоў таму неяк выходжу з кватэры і бачу ў пад'ездзе мёртвую зязюлю. Падумала, што нешта здарыцца, і памерла мая мама. Бываюць такія знакі, на якія я звяртаю ўвагу. Апошні раз я сутыкнулася з гэтым у вёсцы Дальва. Яе напаткаў той жа лёс, што і Хатынь. Там ёсць пранізлівы да слёз мемарыяльны комплекс: уздоўж былой вуліцы размешчаны помнікі ў выглядзе зрубаў хат. І на адным з ганкаў — выява дудачкі, скрыпкі — там жыў музыкант. Калі падышла да яе (гэта быў пачатак чэрвеня), то закукавала зязюля. Я была вельмі ўзрушаная.

— У Акадэміі музыкі вы ўзначальваеце кафедру кампазіцыі. Скажыце, як музыканту, чалавеку творчаму раскрыць свой талент і патэнцыял? І якую ролю ў гэтым адыгрываюць яго настаўнікі?

— У педагогаў двухузроўневая місія. Па-першае, якія б здольнасці не меў студэнт, ты павінен навучыць яго рамяству. Гэта праграма мінімум. А максімум для педагога — выхаваць творчую асобу. Аднак тут мала толькі намаганняў выкладчыка. Абавязкова патрэбна зваротная сувязь ад вучня. У мяне вось неяк вучыўся адзін даволі адораны хлопец, а потым у нейкі момант сышоў у іншую сферу, бо жаданне зарабляць вялікія грошы для яго аказалася важнейшае за музыку. Наша ж праца патрабуе засяроджанасці, напружанасці. Як казаў Анатоль Франс, у мастацтве існуе дзве праблемы: рамеснік, які не мастак, і мастак, які не рамеснік. Адзін можа быць таленавітым, але не давучыцца, іншы — сціплы па здольнасцях, але, дзякуючы зацікаўленасці, упартай працы, адданасці прафесіі, вырастае у буйную творчую асобу.

«Я сваім студэнтам кажу, што творчая праца не бывае дарэмнай».

— Вашы выкладчыкі ў чым аказалі на вас уплыў?

— Яны — вялікія людзі. Анатоль Багатыроў быў, напрыклад, вельмі аўтарытарным чалавекам, але з яго класа ўсе вучні выйшлі абсалютна рознымі: і Лучанок, і Картэс, і Смольскі, і Вагнер. І гэта вялікая рэч для выкладчыка, калі яго вучні не падобныя адзін да аднаго. Анатоль Багатыроў быў чалавекам з выключнай настаўніцкай інтуіцыяй. Ён здолеў у хлопцы з чыгуначнага тэхнікума разгледзець аднаго з лідараў беларускай кампазітарскай школы — Яўгена Глебава. Я хацела б мець такую ж інтуіцыю. А Дзмітрый Смольскі, Сяргей Картэс — прыклад для мяне ў сваёй адданасці музыцы. Усе мае выкладчыкі былі для мяне ў чымсьці ўзорамі. І калі на праслухоўванні яны рабілі мне заўвагі, гэта заўсёды было дарэчы. А сучасныя вучні, здаецца, нікога не слухаюць. І ўвогуле зараз час татальнага раўнадушша, калі нават ніхто нікому не зайздросціць. Напісаў, што захацеў, выклаў у сеціва, зарабіў свае «ўпадабайкі» і супакоіўся. Я ж вучу сваіх студэнтаў таму, як важна, калі побач з табой таленавіты чалавек, гледзячы на якога ты імкнешся цягнуцца ўверх, стаць яшчэ лепшым.

— У 90-я вы былі вядучай праграмы на радыё пра класічную музыку, і гэта было запатрабавана. Як думаеце, з улікам таго, што, напрыклад, урокі музыкі ў школе скарачаюцца, ці трэба сёння выхоўваць разуменне добрай музыкі ў шырокай аўдыторыі?

— Патрэбна дзяржаўная палітыка падтрымкі кампазітараў. У нас жа нават няма дзяржаўнага нотнага выдавецтва. Згадайце перыяд, калі ў канцэртнай практыцы павінен быў быць пэўны працэнт беларускай музыкі, тое, можа, не ўсім падабалася, але творы беларускія гучалі. І гэта важна, таму што падаць сябе, «раскруціць» далёка не кожны можа. Ці іншы горкі прыклад: калі ў 2002 годзе Андрэй Паначэўны стаў лаўрэатам Міжнароднага конкурсу імя П. І. Чайкоўскага, мне здавалася, што гэта павінна быць нацыянальнае свята, але — цішыня. А вось пасля «Еўрабачання» нашу спявачку сустракалі шматлікія прадстаўнікі СМІ, напісаўшы, што яна ўзяла «пачэснае 17-е месца».

— У вас шэраг твораў, напісаных па матывах паэзіі. Чыімі радкамі вы маглі б ахарактарызаваць сябе сённяшнюю?

— Усе мае ўпадабанні і ў літаратуры, і ў жывапісе засталіся нязменнымі з маладосці. Але зараз успамінаю радкі Ігара Губермана «Где страсти, где ярость и ужасы, где рать ополчилась на рать, блажен, в ком достаточно мужества на дудочке тихо играть». Нягледзячы ні на што, ёсць вось гэтая 420 аўдыторыя і перакананасць мая і маіх калег, што наша місія — захаваць творчы патэнцыял нацыі.

Алена ДРАПКО.

Поўны тэкст інтэрв'ю чытайце на zviazda.by

Прэм'еры і знакавыя юбілеі «Беларускай музычнай восені»

Сёлета музычны форум збірае прыхільнікаў акадэмічнага мастацтва ўжо ў 48-ы раз і знаёміць наведвальнікаў з найлепшымі ўзорамі музычнай спадчыны, творамі ды імёнамі, якія заклікаць адкрыць шырокаму колу асаблівасці розных жанраў і стыляў айчыннай і замежнай музыкі.

Старт фестывалю быў дадзены 25 кастрычніка, а да 29 лістапада аўдыторыю чакае яшчэ шэраг адметных канцэртных праграм. У гэтым годзе «Беларуская музычная восень» праходзіць пад эгідай 85-годдзя Беларускай дзяржаўнай філармоніі, таму і адкрывалася канцэртам, прысвечаным юбілею найстарэйшай канцэртнай арганізацыі краіны. А вось у лістападзе для аматараў музычнага мастацтва маецца тут яшчэ многа цікавых прапаноў.

З 16-га чысла можна трапіць на праграму твораў духоўнай харавой музыкі ў выкананні Дзяржаўнай акадэмічнай харавой капэлы Рэспублікі Беларусь імя Р. Шырмы, што прымеркавана да святкавання 1030-годдзя праваслаўя на нашых землях і да 30-годдзя прыхода і святочнага хору царквы іконы Божай Маці «Усіх тужлівых Радасць» (па блаславенні Высокапраасвяшчэннейшага Веніяміна, Мітрапаліта Мінскага і Заслаўскага, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі). Пры жаданні паслухаць сольныя і ансамблевыя сачыненні Брамса, Шапэна, Ліста, Грыга, Керна, Фралова ў выкананні сямейнага трыа Анастасіі Аляксейчык (фартэпіяна), Ганны Аляксейчык (скрыпка) і Маргарыты Аляксейчык (скрыпка) наведайце канцэрт у малой зале імя Р. Шырмы ў гэты ж дзень.

А 17 лістапада адбудзецца канцэрт Дзяржаўнага акадэмічнага сімфанічнага аркестра Рэспублікі Беларусь, які будзе прысвечаны 20-годдзю творчай дзейнасці яго канцэртмайстра — заслужанай артысткі Беларусі Юліі Стэфановіч. У гэты вечар прысутныя пачуюць канцэрт для скрыпкі з аркестрам Барбера, а таксама сімфанічныя шэдэўры Моцарта, Глазунова і Элгара. За дырыжорскім пультам — Аляксандр Анісімаў.

Таксама сапраўднае свята чакае ўсіх, хто наведае філармонію і 18 лістапада. Нацыянальны акадэмічны народны аркестр Рэспублікі Беларусь імя І. Жыновіча (дырыжор — заслужаны артыст Аляксандр Крамко) падрыхтаваў праграму-прысвячэнне народнаму артысту СССР, рэжысёру Эльдару Разанаву. «Музыка кіно» — канцэрт да 95-годдзя маэстра кіно. Ён аб'яднаў у сабе мелодыі і песні з любімых некалькімі пакаленнямі кінастужак. У сваю чаргу ансамбль салістаў «Класік-Авангард» прадставіць публіцы старонкі беларускай інструментальнай музыкі. Тут прагучаць творы Мікалая Клеафаса Агінскага, Манюшкі і Ельскага, а таксама сачыненні майстроў XX стагоддзя, сярод якіх Падкавыраў, Смольскі і Кур'ян.

Сёлета ў рамках музычнага форуму ў беларускую сталіцу вяртаецца і «Rastrelli Cello Quartet» (віяланчэльны калектыў, які ведаюць ва ўсім свеце). І 21 лістапада ён у сценах філармоніі адзначыць сваё 20-годдзе, выконваючы ў аўтарскіх аранжыроўках класіку, кінамузыку і легендарныя мелодыі «Бітлз». Пасля 23 лістапада нас чакае асобная старонка «Музычнай восені» — канцэрт-адкрыццё юбілейнага 55-га сезона Дзяржаўнага камернага аркестра Рэспублікі Беларусь. З гэтай нагоды калектыў пад кіраўніцтвам галоўнага дырыжора заслужанага артыста Расіі Яўгена Бушкова падорыць слухачам канцэртную праграму, што ахоплівае тры стагоддзі сусветнага музычнага мастацтва. У якасці саліста ў другім аддзяленні выступіць народны артыст Расіі Фрыдрых Ліпс.

У малой зале імя Р. Шырмы 26 лістапада Мінскі струнны квартэт і заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь піяніст Юрый Гільдзюк прэзентуюць «Музыку геніяў розных эпох». Завяршальным акордам «Беларускай музычнай восені» стане канцэрт маладога беларускага піяніста, лаўрэата прэстыжных конкурсаў Уладзіслава Хандогага. Музыкант, якога называюць новай зоркай музычнага небасхілу і які ўмее спалучаць тэмперамент і стыль, выканае канцэрт № 2 соль мажор для фартэпіяна з аркестрам Чайкоўскага ў суправаджэнні сімфанічнага аркестра Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Рэспублікі Беларусь. А ў першым аддзяленні слухачам прапануюць прэм'ерныя выкананні канцэртных уверцюр беларускіх кампазітараў.

Алена ДРАПКО.

«ЛІСТАПАД» АДКРЫВАЕ МАЛАДЫЯ ТАЛЕНТЫ

Адной з адметнасцяў сёлетняга «Лістапада» стала тое, што многія мерапрыемствы ў межах кінафестывалю накіраваны на моладзь: аб гэтым арганізатары конкурсу казалі неаднойчы. Акрамя праграмы «Лістападзіка», дзе былі прадстаўлены стужкі пра сучасных падлеткаў, упершыню ў рамках фестывалю прайшоў маладзёжны форум. Чаму мультфільмы не заўсёды пра дзяцінства і як маладыя бачаць кіно? Разбіраліся разам з удзельнікамі.

Усё, што вы хацелі ведаць пра «Смяшарыкаў», але баяліся спытаць

Так аніматар Дзяніс Чарноў нефармальна назваў свой майстар-клас, які прайшоў на кінастудыі «Беларусьфільм». Дзяніс Чарноў стаяў каля вытокаў стварэння «Смяшарыкаў» — вядомага мультсерыяла, які за 20 гадоў вырас да цэлага сусвету. Складана знайсці дзіця і нават дарослага, які не ведае гэтых смешных кругленькіх жывёл. Толькі на першы погляд «Смяшарыкі» падаюцца дзіцячым прадуктам: шматлікія даследаванні, кінаэсэ і разборы крытыкаў сведчаць аб тым, што гэты мультфільм — шматсэнсоўнае разважанне аб чалавеку.

У некаторых серыях можна знайсці візуальныя цытаты на стужкі «Форэст Гамп» Роберта Зямекіса і «Прыгажосць па-амерыканску» Сэма Мендэса, схавалася там і алюзія на савецкі мультфільм «Вожык у тумане» Юрыя Нарштэйна. А на вобраз аднаго з герояў сусвету «Смяшарыкаў», працавітага мядзведзя Капатыча, аўтараў натхніў... акцёр Анатоль Папанаў.

— У многіх серыях мы, як кантрабандысты, хавалі другое дно, аб якім нам было цікава паразважаць, — распавёў падчас сустрэчы Дзяніс Чарноў. — Усё гэта было замаскіравана. Але, безумоўна, ёсць і звычайныя забаўляльныя, камедыйныя серыі.

Падчас майстар-класа гледачам паказалі «Жыццё на воблаку» — серыю, якая распавядае аб клінічнай смерці. Зразумела, што галоўная ідэя завуалявана: калі маленькая аўдыторыя проста ўбачыць гісторыю пра жыццё ў высокіх гарах з прыгожымі аблокамі, то больш дарослы глядач счытае метафару нечаканай катастрофы.

Менавіта дзякуючы разнапланавасці персанажаў і сэнсаў «Смяшарыкі» прыцягваюць людзей розных узростаў. Сведчаннем гэтаму сталі і наведвальнікі майстар-класа: на «Беларусьфільм» прыйшлі як маленькія дзеткі з бацькамі, так і студэнты рэжысёрскіх спецыяльнасцяў. І калі дарослых цікавілі больш тэхнічныя пытанні, напрыклад, пераход фармату з 2D у 3D, то маленькая аўдыторыя задавала пытанні, звязаныя з характарамі герояў і іх хобі. Адно з пытанняў — чаму вясёлае зайчаня Крош заўсёды гуллівае і ці ведаюць яго сябры, што ён гімнаст.

— Разумееце, ён халерык — ёсць такі тыпаж персанажаў, у якіх рукі дзейнічаюць раней за галаву. Мы якраз імкнуліся абвастрыць героя, зрабіць так, каб кожны з іх валодаў ярка выяўленай характарыстыкай. Але пры гэтым заўсёды выдатна, калі ў героя ёсць яшчэ нешта схаванае. Так той жа энергічны Крош, на мой погляд, — галоўны філосаф ва ўсёй кампаніі. Дваістасць лініі заўсёды надае героям праўдападобнасць, цікавасць і глыбіню, — адзначыў аніматар.

Сустрэча атрымалася карыснай для ўсіх наведвальнікаў: дзеці нарэшце даведаліся, ці было паміж свінкай Нюшай і Барашам узаемнае каханне, а студэнты атрымалі парады па стварэнні характараў персанажаў, прапісванні сюжэтаў і рабоце ў камандзе.

Беларуская міфалогія, дзіцячыя траўмы і пахаванне

Гэтыя і іншыя тэмы будучых фільмаў прагучалі падчас пітчынгу, што ладзіўся ў рамках маладзёжнага форуму. Удзельнікамі конкурсу сталі студэнты і выпускнікі Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, а таксама Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры. Хлопцам і дзяўчатам належала за 5 хвілін прэзентаваць сваю ідэю: трэба было не толькі распавесці аб сюжэце і герояў стужкі, але і падзяліцца рэферан-

Фота Лізаветы ГОЛАД.

самі — фільмамі, якія натхнілі; а таксама адзначыць лакацыі, дзе карціна будзе здымацца. Хвалюючае. Асабліва калі разумееш, што твой фільм пакажуць у конкурснай праграме «Кіно маладых» на наступным «Лістападзе». У склад журы ўвайшлі генеральны дырэктар кінастудыі «Беларусьфільм» Уладзімір Карачэўскі, рэжысёр Алена Турава, першы сакратар Цэнтральнага камітэта БРСМ Аляксандр Лук'янаў, а таксама расійскія кінапрадзюсары і рэжысёры.

Зразумела, што абраць ідэю кожнага немагчыма. Менавіта таму падчас пітчынгу трэба ў першую чаргу зацікавіць журы. Нехта з удзельнікаў скараў яскравай прэзентацыяй, іншыя абралі стратэгію жывога дыялогу — распавядалі са сцэны аб сваёй канцэпцыі і ахвотна адказвалі на пытанні.

Так, Вадзім Ларчанка, студэнт 4 курса Акадэміі мастацтваў, прапанаваў ідэю кароткага метра, які ўзнімае пытанне гвалту на вуліцы. Маладой спартсменцы-каратыстцы неабходна зразумець, дзе праходзіць мяжа паміж самаабаронай і агрэсіяй.

Адразу некалькі ідэй фільмаў, якія прагучалі падчас пітчынгу, былі прысвечаны дзіцячым траўмам і пераадоленню іх у дарослым узросце. Адметна, што тэма прагучала неаднойчы: моладзь цікавіцца ментальным здароўем і жадае адлюстраваць на экране, як неабходна ўважлівае стаўленне бацькоў да страхаў, жаданняў і мар дзяцей. Так, першакурсніца Акадэміі мастацтваў Аліса Лісок прапанавала канцэпцыю камедыі-прытчы «Ванька-пастух ды Іван-праграміст». Ідэя будучага фільма пайшла з наступнай гісторыі: хлопчык, які нарадзіўся ў вёсцы, марыць аб працы пастуха. Але школьная настаўніца яго высмейвае. Малады Іван вырашае адпавядаць стандартам сацыуму і абірае «правільную» прафесію: становіцца праграмістам — хлопцу гэта не прыносіць ні шчасця, ні задавальнення.

Адной з парад, якую сябры журы накіроўвалі амаль усім удзельнікам пітчынгу, было канкрэтызаванне ідэі. Сапраўды, сусвет кіно, асабліва прадзюсарскі напрамак — рэч жорсткая, зацікавіць трэба з першых секунд. Удзельнікамі пітчынгу сталі і больш вопытныя маладыя, якія паспелі ўжо атрымаць рэжысёрскі вопыт. Выпускнік Акадэміі мастацтваў Кірыл Халецкі ў мінулым годзе ўжо адзначыўся на «Лістападзе» ў конкурснай праграме кароткаметражных фільмаў. Там рэжысёр прадставіў свой фільм «Дарога». Зараз Кірыл прапанаваў ідэю філасофскага фільма пад інтрыгоўнай назвай «Ніхто не прыйдзе на маё пахаванне». Стужка павінна прымусіць гледача задумацца аб тым, наколькі вартае жыццё ў яго было.

А вось студэнт 4 курса Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Максім Папоў звярнуўся да тэмы беларускага фальклору, сваю будучую стужку пад назвай «Чортава гара» ён плануе насыціць старажытнымі абрадамі, а таксама героямі этнасу. Адно з пытанняў, якое Максім узнімае ў сваім фільме: ці не забывае беларуская моладзь свае карані і культуру?

Сярод канцэпцый, якія сябры журы таксама пачулі падчас пітчынгу, былі містычныя стужкі, а таксама хорары. Адметна і тое, што ўсе ўдзельнікі конкурсу хацелі б зняць свае фільмы ў беларускіх лакацыях: плануюць задзейнічаць як сталіцу, так і глыбінку. Спадзяёмся, што ў наступным годзе «Лістапад» парадуе гледачоў цікавымі і запамінальнымі стужкамі маладых аўтараў.

Дыялог з дарослымі

У рамках «Лістапада» ў кінатэатры «Беларусь» паказалі праграму анімацыі для дарослых гледачоў пад агульнай назвай «Вобразы вайны». У праграме былі прадстаўлены мультыплікацыйныя стужкі вытворчасці Беларусі, Сербіі, Італіі, Палесціны і Расіі. Праз работы, прысвечаныя розным гістарычным эпохам, агульным лейтматывам праходзіць думка аб лёсе звычайнага чалавека перад тварам вайны. «Звязда» распавядае, як аніматары з розных частак свету адлюстроўваюць самае страшнае.

ДЗЯЎЧЫНА-НОЧ

Мастак-мультыплікатар Ахмад Салех у супрацоўніцтве адразу з некалькімі краінамі — Палесцінай, Катарам, Іарданіяй і Германіяй — стварыў трагічную прытчу аб маці, якая шукае сваю дачку: «Хто-небудзь бачыў дзіця, якое згубіла сваю маці?» — пытаецца жанчына ў пустэчу. Вакол — паўразбураныя шматпавярховікі, якія рэхам адбіваюць яе запыт. Усе героі быццам у паўсне: яны не звяртаюць увагі ні на выбухі, ні на разбомбленыя будынкі. Вайна — гэта жудасны фон, музыка, якая не сціхае.

СВЯТОЧНЫЯ АЛАДКІ І ПОЛІЎКА ДЛЯ СВІННЯЎ

«Дзеці вайны» — мультыплікацыя расійскага рэжысёра з Якуціі Сардааны Барабанавай. У аснову дакументальна-мастацкай работы ляглі гісторыі жыхароў Якуціі, якія падчас вайны былі дзецьмі. Менавіта іх галасамі вядзецца апавяданне. Жудасныя і натуралістычныя падрабязнасці: «Свіней кармілі поліўкай з мяса хворых цялят — я гэта еў», «Да Пакрова мы хадзілі без абутку, цёплага адзення ў нас не было. Ногі стылі так, што даводзілася саграваць іх сваёй мачой» перамяжаюцца са шчаслівымі ўспамінамі Перамогі: «У дзень, калі настаўнік сказаў, што мы перамаглі, ва ўсёй вёсцы пяклі аладкі. Я да гэтага часу больш ніколі не адчувала такога моцнага паху».

263 НОЧЫ

Кінастудыя «Беларусьфільм» прадставіла работу Ірыны Тарасавай: мультыплікацыйная стужка распавядае аб лёсе 26 яўрэяў, якія пасля знішчэння Мінскага гета хаваліся ў падвале дома. У аснову «263 начэй» таксама пакладзена дакументальна засведчаная гісторыя:

— Нягледзячы на багаты візуальны рад, гэта поўнасцю дакументальная гісторыя, — распавяла Ірына Тарасава. — Мы не выбудоўвалі сюжэт і нічога не дадавалі ад сябе, гісторыя склалася з расповедаў дзяцей, якія былі ў тым падвале. На пачатку працы над фільмам у жывых заставаліся чатыры выратаваныя, у цяпер — двое.

РЭЧАІСНАСЦЬ І СЮРРЭАЛІЗМ

Расійская стужка «Чужы хлеб» рэжысёра-мультыплікатара Андрэя Бахурына расказвае пра дзяўчынку, якая ў блакадным Ленінградзе нясе хлеб старэнькай суседцы. Усю дарогу за дзяўчынкай сочыць смерць, прымаючы абліччы бомбы, цені, мінака на вуліцы.

Галоўнай адметнасцю стужкі стала яе анімацыйная частка. У манахромнай рабоце Бахурына толькі два героі маюць каляровыя дэталі: у дзяўчынкі гэта чырвоны капялюшык, у суседкі — залацісты медальён. Быццам яны адзіныя, хто пакуль застаўся ў сусвеце ў жывых.

ПАМЫЛКА Ў ПЕРАКЛАДЗЕ

«Міласэрны анёл» — сербскі мультфільм Бэціны Срэмко. У стужцы, якая нагадвае работы экспрэсіяністаў, расказваецца аб авіяўдарах НАТА, што адбыліся ў 1999 годзе ў былой рэспубліцы Югаславія.

На працягу ўсёй стужкі ніхто з герояў не размаўляе, толькі ў апошніх кадрах глядач на чорным экране бачыць словы: «Аперацыя НАТА называлася «Высакародная накавальня», але з-за памылкі ў перакладзе прыжылася назва «Міласэрны анёл».

«ЛІСТАПАД» ВЯРТАЕЦЦА ДА ВЫТОКАЎ

У апошні дзень фестывальнага тыдня аргкамітэт правёў прэс-канферэнцыю, падчас якой былі падведзены вынікі сёлетняга «Лістапада». Сярод галоўных адметнасцяў конкурсу — шматлікія паказы ў рэгіёнах, падпісаныя пагадненні аб супрацоўніцтве з іншымі краінамі, а таксама вяртанне да вытокаў, расказаў генеральны дырэктар «Беларусьфільма» Уладзімір КАРАЧЭЎСКІ:

— Наш фестываль прайшоў па ўсёй краіне: стужкі былі прадстаўлены ў 70 гарадах. Толькі ў рэгіёнах прайшло 250 сеансаў, у Мінску — каля 60. У рамках «Лістапада», акрамя конкурснай праграмы, былі паказаны фільмы з «Залатой калекцыі», таксама адбыліся прэм'еры. Да нас ужо прыходзяць запрашэнні да ўдзелу ў розных фестывалях: нам прапануюць правесці Дні беларускага кіно ў рамках «Арктычнага фестывалю», што праходзіць на Чукотцы. Падчас правядзення «Лістапада» былі заключаны дзелавыя пагадненні. Мы дамовіліся з каналам «Культура» аб шчыльным супрацоўніцтве, а таксама падпісалі пагадненне з кампаніяй «Лендок» аб рабоце над сумесным фільмам, прысвечаным 100-годдзю беларускага кіно.

Дырэктар «Беларусьфільма» адзначыў, што конкурснае журы было прыемна здзіўлена пітчынгам маладзёжных работ: студэнты прадставілі сваі ідэі на годным, дарослым узроўні. Таксама ў рамках фестывалю прайшло шмат майстар-класаў, падчас якіх спецыялісты з розных краін паведамлялі ўсім ахвотным аб анімацыі, кінарэжысуры, гуказапісе і прадзюсарстве. «Лістапад» адзначыўся і шырокай геаграфіяй: свае фільмы прадставілі кінематаграфісты Заходняй Еўропы, Бліжняга Усходу, Паўднёва-Усходняй Азіі, Афрыкі і краін СНД. А на самім фестывалі прысутнічала каля 100 гасцей. Ад імя арганізатараў і ўдзельнікаў «Лістапада» Уладзімір Карачэўскі выказаў падзяку Прэзідэнту нашай краіны за падтрымку фестывалю, а таксама за дапамогу ў яго развіцці.

Старшыня фестывалю, народны артыст Беларусі Аляксандр ЯФРЭМАЎ звярнуў увагу на тое, што «Лістапад» усё больш вяртаецца да ўласных вытокаў:

— Галоўная задача, якую мы ставілі перад сабой, — атрымаць уласнага гледача. І нам гэта ўдалося. Праграма фестывалю была накіравана на тое, каб сказаць нашым гледачам: варта жыць, спадзявацца, кахаць. На мой погляд, сёлетні «Лістапад» гэту задачу выканаў.

У наступным нумары «Звязда» распавядзе аб пераможцах конкурсу.

Матэрыялы паласы падрыхтавала Арына КАРПОВІЧ.

Коммунальное унитарное предприятие «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ» 14 декабря 2022 г. проводит открытый аукцион № 02-НС-22 по продаже не завершенного строительством незаконсервированного капитального строения и земельного участка

Вид аукциона: открытый (на повышение начальной цены). **Предмет аукциона:** не завершенный строительством жилой дом и земельный участок, необходимый для обслуживания не завершенного строительством жилого дома. Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 № 220.
Вид вещного права на земельный участок: частная собственность

№ предмета аукциона	Место-расположение земельного участка	Кадастровый номер земельного участка	Площадь, га	Целевое назначение земельного участка/ назначение земельного участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества	Начальная цена предмета аукциона, бел. руб.	Сумма задатка, бел. руб.	Описание не завершенного строительством жилого дома, его составных частей и принадлежностей	Отдельные условия, предусмотренные в решении Мингорисполкома о проведении аукциона и предоставлении земельного участка и иные условия аукциона
1	2	3	4	5	6	7	8	9
1	г. Минск, ул. Люцинская, 36	500000000 006006000	0,1000	Для строительства и обслуживания жилого дома по ул. Люцинской, 36/ земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания одноквартирного (блокированного) жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме)	170 815,67 (в том числе: начальная цена земельного участка площадью 0,1000 га – 146 860,00; начальная стоимость не завершенного строительством незаконсервированного жилого дома в соответствии с оценочной стоимостью – 23 955,67	34 000,00	Фундамент – монолитный железобетонный. Наружные и внутренние стены – газосиликатные блоки. Перегородки, перекрытия, крыша, полы – отсутствуют. Наружная площадь составляет 91 м². Степень готовности – 36 %. Физический износ конструкций составляет 10 %	Обязательства победителя аукциона либо единственного участника несостоявшегося аукциона определены пунктом 5 решения Мингорисполкома от 20.10.2022 № 3562*

**в том числе:*
в течение десяти рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона внести плату за предмет аукциона;
в течение десяти рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона или признании аукциона несостоявшимся возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения;
в течение двух месяцев со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона или признании аукциона несостоявшимся обратиться в РУП «Минское городское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» за государственной регистрацией возникновения права частной собственности на предмет аукциона;
в течение одного месяца со дня осуществления государственной регистрации права на земельный участок обратиться в администрацию Фрунзенского района г. Минска для получения разрешительной документации на продолжение строительства объекта;
в течение одного года со дня осуществления государственной регистрации права на земельный участок и утверждения в установленном порядке разрешительной и технической документации на строительство объекта приступить к освоению земельного участка в соответствии с его целевым назначением;
в течение трех лет со дня осуществления государственной регистрации права на земельный участок в установленном порядке завершить строительство жилого дома;
использовать земельный участок в соответствии с целью и условиями его предоставления;
не нарушать права иных землепользователей и иные условия.

Инженерные коммуникации на указанном земельном участке отсутствуют.

Инженерное развитие инфраструктуры застраиваемой территории участков осуществляется в соответствии с техническими условиями на инженерно-техническое обеспечение соответствующего объекта, выданными эксплуатирующими и согласующими организациями (согласно перечню, установленному Минским горисполкомом).

Аукцион состоится 14 декабря 2022 года в 16.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

Участниками аукциона могут быть, если иное не установлено законодательными актами, граждане Республики Беларусь и негосударственные юридические лица Республики Беларусь. В аукционе допускается участие на стороне покупателя консолидированных участников – двух и более граждан, юридических лиц.

Для участия в аукционе необходимо:

внести задаток не позднее 8 декабря 2022 г. в размере, указанном в графе 7 таблицы, перечисляемый на расчетный счет BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк» г. Минск, БИК BLBBBY2X, код платежа – 40901, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583, назначение платежа – задаток для участия в аукционе № 02-НС-22;

представить в коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости» (организатору аукциона) следующие документы:

заявление на участие в аукционе;

документ, подтверждающий внесение суммы задатка, с отметкой банка;

подписанное соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, включающее обязательство по уплате в соответствии с законодательством штрафных санкций и иные требования;

дополнительно представляется:

гражданином – копия документа, удостоверяющего личность без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина – доверенность, оформленная в соответствии с требованиями законодательства;

